# ФАНЕТЫКА.
# АРФАЭПІЯ.
# ГРАФІКА.
# АРФАГРАФІЯ

# <u>РЭПЕЦІТАР</u>
# <u>ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ, ГРАФІКА, АРФАГРАФІЯ</u>
# <u>ФАНЕТЫЧНЫЯ ЗАКОНЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ</u>

Усе пазіцыйныя чаргаванні падпарадкоўваюцца асноўным фанетычным законам. Для **сучаснай беларускай мовы яны наступныя:**

**1. АКАННЕ**– закон змянення гукаў /о/, /э/ на /а/ у слабай пазіцыі: цэны –ацаніць, бок – бакі

1. **ЯКАННЕ-** закон змянення гукаў /о/, /э/ на /а/ пасля мяккіх зычных у першым складзе перад націскам: лес – лясны: /л'эс/ - /л'асны/. Яканню падлягае і вымаўленне службовых слоў (у адным фанетычным слове разам з самастойнымі часцінамі мовы), але на пісьме гэтая з'ява не перадаецца: /н'а быў/ - не быў; /б'аз зуба/ - без зуба.

На словы іншамоўнага паходжання, за рэдкімі выключэннямі, з'явы акання і якання не распаўсюджваюцца: /к'эфір/, /м'этро/, але: /йафрэйтар/, /кал'андар/, /с'аржант/, /дал'ікатэс/. Напісанне адпаведнае: кефір, метро, яфрэйтар, каляндар, сяржант, далікатэс.

2. **ЗАКОН АГЛУШЭННЯ ЗВОНКІХ ЗЫЧНЫХ**- дзейнічае на канцы слоў перад паўзай (выключэнняў няма): зуб -/зуп/, /медзь -/м'эц'/, дождж -/дошч/.
3. **ЗАКОН ПРЫПАДАБНЕННЯ ЗЫЧНЫХ ПА ГЛУХАСЦІ І ЗВОНКАСЦІ** (асіміляцыя па глухасці і звонкасці) – гэта аглушэнне звонкіх перад глухімі: градка - /гратка/, без суму - /б'ас суму/; азванчэнне глухіх перад звонкімі: айсберг -/айз'б'эрх/, малацьба - /маладз'ба/.
4. **АСІМІЛЯЦЫЯ ПА МЯККАСЦІ** – ёй падлягаюць свісцячыя /з/, /с/, калі апынаюцца ў пазіцыі перад мяккім (за выключэннем заднеязычных /г'/, /к'/, /х'/); змякчаюцца таксама /д/ і /т/ перад /в'/: збор /збор/ - збіраць /з'б'ірац'/, спаць /спац'/ - спіць /сп'іц'/, два /два/ - дзве /дз'в'э/, чатыры /чатыры/ - чацвёрты - /чац'в'орты/. АЛЕ: скеміць /ск'эм'іц'/, згінуць /зг'інуц'/, схіліцца /сх'іл'іцца/.
5. **АСІМІЛЯЦЫЯ СВІСЦЯЧЫХ ДА ШЫПЯЧЫХ І ШЫПЯЧЫХ ДА СВІСЦЯЧЫХ-** шыпячыя прыпадабняюцца да свісцячых: збіраешся - /з'б'ірайэс'с'а/; свісцячыя прыпадабняюцца да шыпячых: сшыць - /шшыц'/.
6. **ДЗЕКАННЕ І ЦЕКАННЕ** – змяненне /д/ на /дз'/ і /т/ на /ц'/ пры памякчэнні ў роднасных словах: іду –ідзе, рот – у роце.
7. **ЗАКОН УЗНІКНЕННЯ ПРЫСТАЎНЫХ ГУКАЎ**: акно –вокны, высокае ржышча – іржышча колецца; аржаны; гэты; дагэтуль і інш.
8. **ФАНЕТЫЧНАЕ ПАДАЎЖЭННЕ** – закон падоўжанага вымаўлення гукаў /з'/, /с'/, /дз'/, /ц'/, /л'/, /н'/, /ж/, /ч/, /ш/ у становішчы паміж галоснымі. Перадаецца на пісьме: паданне, ноччу, падарожжа, жыццё. ВЫКЛЮЧЭННІ: Ільа, Ульяна, Ульянаў і выт. ад іх.

**<u>УВАГА!</u>** Неабходна размяжоўваць фанетычнае падаўжэнне з марфалагічным падваеннем (узнікненнем дзвюх аднолькавых літар на стыку марфем: бясстрашны, каменны) і з уласна доўгімі гукамі ў запазычаных словах-выключэннях, дзе на пісьме захоўваюцца дзве літары: ванна, манна, Мадонна і інш.

9. **ЗАКОН ПЕРАХОДУ /у/, /в/ і /в'/ у /ў/** - закон пераходу /у/ у /ў/ дзейнічае пасля галосных, закон пераходу /в/ і /в'/ у /ў/ дзейнічае пасля галоснага перад зычным і на канцы слова: увага – пад увагай – на ўвазе; трава – траўка; хлопец-умелец – хлопцы-ўмельцы; паплавы – поплаў.

# ФАНЕТЫЧНЫЯ ЗАКОНЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***У цяперашні час у нашай мове найбольш актыўна дзейнічаюць наступныя фанетычныя законы:***

1) закон аглушэння звонкіх зычных на канцы слоў (*грыбы – гры/п/, маразы – маро/с/).* Выключэнняў няма. З закону вынікае, што на канцы слова перад паўзай у сучаснай беларускай мове звонкія зычныя ніколі не сустракаюцца;
2) закон аглушэння звонкіх перад глухімі і азванчэння глухіх перад звонкімі ( *грады – гра/т/кі, насіць – но/з'/біт).* Значыць, у словах беларускай мовы побач могуць знаходзіцца або два глухія, або два звонкія зычныя гукі;
3) закон памякчэння свісцячых перад мяккімі зычнымі, акрамя /г'/, /к'/, /х'/ ( */з'/няць, /ц'/вёрды, /с'/мех, /дз'/веры).*
   АЛЕ: <u>*/с/кеміць, /з/гінуць, /с/хібіць;*</u>
4) закон прыпадабнення свісцячых да шыпячых і шыпячых да свісцячых (*расказаць – ра/ш/часаць, рыхтуеш – рыхтуе/с'/ся);*
5) закон змянення /д/ на /дз'/ і /т/ на /ц'/ пры памякчэнні (*барада – на барадзе, білет – білецік)* Гукаў /д'/, /т'/ у беларускай мове, у адрозненне ад рускай, няма. **Дзеканне і цеканне** – адметная рыса беларускага вымаўлення, яна замацавана і на пісьме;
6) закон змянення /о/, /э/ на /а/ у пазіцыі не пад націскам (*поўнач – паўночны, сок – сакавіты, цэны – цана, рэзаць – выразаць).* Гэта з'ява носіць назву **аканне**, яна перадаецца на пісьме. Аканне пасля мяккіх зычных мае свае асаблівасці – дзйнічае толькі ў першым складзе перад націскам: */в'о/сны - /в'а/сна, /м'э/х - /м'а/шок,* але */в'э/снавы, /м'э/шкавіна.* На пісьме аканне пасля мяккіх зычных выступае ў выглядзе чаргавання літар **е,ё – я,** таму мае яшчэ і адметную назву – **яканне** (*лёд – лядок, несці – нясу).* Яканне – спецыфічная рыса беларускай мовы. Запазычаныя словы даволі часта не падпарадкоўваюцца закону акання і якання: *рэкорд, трыо, медаль, сезон;*
7) закон узнікнення прыстаўных гукаў. Прыстаўныя галосныя /і/, /а/ з'ўляюцца перад збегам зычных, які пачынаецца з санорных /л/, /р/: *ільгота, іржышча, ірваць, аржаны.* У патоку маўлення прыстаўныя галосныя знікаюць, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны гук: *каля львіцы, многа льну, яблыкі рдзеюць (але: з ільвіцай, шмат ільну, ірдзеюць яблыкі).* Прыстаўны зычны /в/ з'яўляецца перад пачатковым націскным /о/: *азёры – возера, аблічча – воблік, асенні – восень.* Прыстаўны /й/ з'яўляецца ў некаторых словах перад пачатковым націскным /і/ (на пісьме гэта не адлюстроўваецца): */йі/ншы, /йі/ней, /йі/скра.* У запазычаных словах прыстаўныя гукі не ўзнікаюць;
8) закон змянення /у/ на /ў/ у пазіцыі пасля галосных, а таксама /в/, /в'/ на /ў/ у пазіцыі пасля галоснага перад зычным і ў канцы слова: *урок – на ўроку, трава – траўка, крыві – кроў.* Гук губнога ўтварэння /ў/ - адна з прыкметных асаблівасцей беларускай фанетыкі.

# РЭПЕЦІТАР
# ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ, ГРАФІКА, АРФАГРАФІЯ
# ФАНЕТЫЧНЫЯ ЗАКОНЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**ЗАДАННІ**

*№1. Знайдзіце ў тэксце словы, у якіх праяўляецца аканне і яканне.*
Творы Янкі Купалы абуджаюць светлае жаданне ўбачыць увачавідкі тыя мясціны, што ўзгадавалі яго, тыя сцежкі і дарогі, па якіх хадзіў вялікі пясняр, выкрасаючы з сэрца асветленыя магутным розумам радкі, што ўвабралі ў сябе гэтак шмат народных дум, людской журбы, радасных спадзяванняў і здзяйсненняў.

*№2. Размяркуйце словы на чатыры групы і запішыце:*
*1. Асіміляцыя па глухасці і звонкасці,*
*2. Асіміляцыя па мяккасці.*
*3. Асіміляцыя свісцячых да шыпячых.*
*4. Асіміляцыя шыпячых да свісцячых.*
Адказ, перабежчык, сцежка, дзверы, на дарожцы, носішся, цвёрды, счарствець, плацдарм, звечарэла, езджу, адвезці, айсберг, сшыць, стажкі, мясціна, носьбіт, на талерачцы, расчасаць, смешны, футбол, пясчаны, у печцы.

*№ 3. Падкрэсліце словы, у якіх ёсць падоўжаныя зычныя.*
Ралля, багацце, асіннік, суддзя, аддзячыць, падаконнік, каменны, аддаць, каменне, пытанне, купацца, гуллівы.

*№ 4. Вызначце, у якіх словах гукі /і/ і /а/ з'яўляюцца прыстаўнымі.*
Дрот іржавы; з аўса; ён ілжывы; мець ільготы; з амшарыны; ад інею; з аркуша; падігліцай; абрус; пад амністыю.

*№ 5. Запішыце словы па-беларуску. Растлумачце напісанне літары Э.*
Директор, текст, студент, терем, церемония, дрезина, почерк, тема, энергичный, инженер, бизнесмен, делегат, тенденция, сонет, новелла, эссе, игрек, секрет, кремль, кремлёвский, рецепт, ремонт, сердце, экзамен, деликатес, турне, эстетика, телеателье, канцелярия, декабрист, брезент, капелла, майонез, адрес, секретарь, предприниматель.

# РЭПЕЦІТАР
# ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ, ГРАФІКА, АРФАГРАФІЯ
# ФАНЕТЫЧНЫЯ ЗАКОНЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

## АДКАЗЫ

№ 1. *Знайдзіце ў тэксце словы ў якіх праяўляецца аканне і яканне.*

**АКАННЕ:** *увачавідкі – вочы, узгадаваны – гадоўля, хадзіў – ходзіць, выкрасаючы – крэсіва.*

**ЯКАННЕ:** *мясціны – месца, яго – ён, вялікі – веліч, пясняр – песня, спадзяванняў – неспадзеўка, здзяйсненняў – здзейсніць, сябе – (гіст.) себя.*

№ 2. *Размяркуйце словы на чатыры групы:*

1) **асіміляцыя па глухасці і звонкасці –** *перабежчык, адказ, плацдарм, айсберг, стажкі, адвезці, носьбіт, футбол, сцежка;*
2) **асіміляцыя па мяккасці –** *сцежка, дзверы, цвёрды, счарсцвець, звечарэла, адвезці, мясціна, смешны, айсберг;*
3) **асіміляцыя свісцячых да шыпячых –** *счарсцвець, езджу, сшыць, расчасаць, пясчаны;*
4) **асіміляцыя шыпячых да свісцячых –** *на дарожцы, носішся, на талерачцы, у печцы.*

№ 3. *Падкрэсліце словы, у якіх ёсць падоўжаныя зычныя.*

*Ралля, багацце, суддзя, каменне, пытанне.*

№ 4. *Вызначце, у якіх словах гукі /і/ і /а/ з'яўляюцца прыстаўнымі.*

*1) Дрот іржавы, 3) ён ілжывы, 4) мець ільготы, 5) з амшарыны.*

№ 5. *Запішыце словы па-беларуску. Растлумачце напісанне літары Э.*

*Дырэктар, тэкст, студэнт, церам, цырымонія, дрызіна, почырк, тэма, энергічны, інжынер, бізнесмен, дэлегат, тэндэнцыя, санет, навела, эсэ, ігрэк, сакрэт, крэмль, крамлёўскі, рэцэпт, рамонт, сэрца, экзамен, далікатэс, турнэ, эстэтыка, тэлеатэлье, канцылярыя, дзекабрыст, брызент, капэла, маянэз, адрас, сакратар, прадпрымальнік.*

# ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА. АРФАГРАФІЯ

## ФАНЕТЫЧНЫЯ І АРФАЭПІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**1. Адзначце словы (спалучэнні слоў), вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:**
1) карагод; 2) касцюм; 3) мярэжка; 4) перакідваць; 5) лес і возера; 6) перамешваць; 7) гарбуз; 8) прыдарожны; 9) паслядоўнік; 10) трава і дрэвы; 11) касцёл; 12) перадрукоўваць; 13) дрозд; 14) лодка; 15) ягады і грыбы; 16) павялічваць; 17) дождж; 18) дуб і бяроза; 19) вузкі; 20) параўнаць; 21) касцісты; 22) рэпартаж; 23) пераконваць; 24) даведка; 25) рабіна і сасна; 26) перад Іванам; 27) грыб; 28) лёгкі; 29) прайграць; 30) узмежак; 31) перазвонь-ваць; 32) склад; 33) касцюковіцкі; 34) высадка; 35) брат і сястра; 36) размераны; 37) дуб; 38) пераздымаць; 39) кладка; 40) з Ігнатам; 41) Змітрок; 42) перасоўваць; 43) граб; 44) абрэзка; 45) сад і поле; 46) таўсцець; 47) воз; 48) холад і снег; 49) водпуск; 50) аспрэчваць; 51) грузчык; 52) адрына; 53) ускіпець; 54) подзвіг; 55) магчыма; 56) зачэпішся; 57) бяс-шумна; 58) лягчэй; 59) размаляваны; 60) схітрыць; 61) схіліць; 62) запозна; 63) выязджаць; 64) салодкі; 65) без зямлі; 66) без віны; 67) адказаць; 68) наймальнік; 69) мітуслівa; 70) схіл; 71) песня; 72) лагчына; 73) сашчапіць; 74) знаходліва; 75) без вестак; 76) летні; 77) скіслы; 78) адбегчы; 79) змагаешся; 80) адсвечваць; 81) скептык; 82) матчын; 83) аб'езд; 84) мажліва; 85) коўзкі; 86) крайні; 87) небяспечны; 88) схема; 89) без спрэчак; 90) безліч; 91) разжаваць; 92) бяздумны; 93) скіраваць; 94) сцежка; 95) лагічна; 96) дзядзька; 97) рас-шпіліць; 98) скінуць; 99) можна; 100) не браць.

**2. Адзначце словы, у якіх літары Я, І, Ё, Е, Ю абазначаюць два гукі:**
1) песня; 2) яблык; 3) паядынак; 4) заганяць; 5) пад'язны; 6) краіна; 7) сінеча; 8) вераб'і; 9) гісторыя; 10) нізіна; 11) вясёлы; 12) ёмістасць; 13) медальён; 14) куп'ё; 15) клён; 16) лес; 17) ленавацца; 18) ельнік; 19) лье; 20) лебядзіны; 21) Юпітэр; 22) людзі; 23) п'юць; 24) юнга; 25) Нюра.

**3. Адзначце словы, у якіх спалучэннем літар ДЗ і ДЖ перадаецца адзін гук:**
1) адзначыць; 2) надзённы; 3) бяздзейнасць; 4) падзямелле; 5) дзяцінства; 6) аджартавацца; 7) джала; 8) пасаджу; 9) паджаць; 10) агароджа; 11) падземны; 12) дзяжурства; 13) вадзіць; 14) адзваніць; 15) адзенне; 16) дажджы; 17) ураджайны; 18) аджаваць; 19) паджылкі; 20) прыязджаць; 21) хаджу; 22) аджыць; 23) паджаць; 24) падзагаловак; 25) надзея; 26) падземка; 27) лебядзіны; 28) падзарабіць; 29) аддзяліць; 30) пэндзаль.

**4. Адзначце нумары слоў, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае:**
1) ехаць; 2) дзверы; 3) бераг; 4) мёд; 5) маёр; 6) носьбіт; 7) аб'ект; 8) весялосць; 9) лью; 10) мельхіёр; 11) снег; 12) агледзься; 13) жыццё; 14) маё; 15) дзьме; 16) салаўі; 17) пасьянс; 18) яма; 19) падземны; 20) дзяжурны; 21) крэйда; 22) дзень; 23) лье; 24) дождж; 25) песня.

**5. Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [ Ч ]** :
1) паляўнічы; 2) перакладчык; 3) суччa; 4) чаргаванне; 5) адчапіць; 6) прытча; 7) чыноўнік; 8) суседчын; 9) чалавечы; 10) човен
**падоўжаны гук [ Ц ]:**
1) палацы; 2) на кладцы; 3) падцмокваць; 4) падцёк; 5) адсадзіць; 6) на палачцы;
7) у дварцы; 8) на сцежцы; 9) цяплець; 10) адцадзіць.

## ПРАКТЫКУМ

**А1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.**

1) спазніцца; 2) расхінуць; 3) не ведалі; 4) палёгка; 5) на варце; 6) скіраваць; 7) з вёскі; 8) Задзвінне; 9) джала; 10) паказчык; 11)пазнішчаць;12)раскідзісты;13)гладчэйшы;14)рэкардсмен;15)паддобрыцца; 16) звечара; 17) скептык; 18) разжаліцца; 19) аскрэбці; 20) аджыць; 21) згінуць; 22) магчымасць;23)знічка; 24) дрозд; 25) расшчодрыцца; 26) зласлівы; 27) расхістаць; 28) ручнік; 29) лагчына; 30) не просіць; 31) небасхіл; 32) разліў; 33) расшыфраваць; 34) з хаты; 35) раскідаць; 36) засмягнуць; 37) падцягнуць; 38) скіфы; 39) нясвіжскі; 40) раздажджыцца; 41) разлік; 42) у лодцы; 43) расхіліць; 44) вадзіца; 45) заезджы; 46) пісьмовы; 47) не ўзяў; 48) схіліць; 49) здзівіцца; 50) спартсмен; 51) згаджацца; 52) смяешся; 53) не мог; 54) з людзьмі; 55) палескі; 56) прароцтва; 57) скеміць; 58) быльнёг; 59) цвёрды; 60) з лесу; 61) хрэсьбіны; 62) схітрыць; 63) бесардэчны; 64) педінстытут; 65) сняданак; 66) не бачыць; 67) згінаць; 68) праз жыта; 69) вільгаць; 70) дарадчык; 71) вішанька; 72) з вясны; 73) футбол; 74) прыязджаць; 75) схема; 76) у спрэчцы; 77) скібіна; 78) з ліпеня; 79) разьбяр; 80) ураджай; 81) сядзьце; 82) скінуць; 83) без памылак; 84) зжаты; 85) ткацкі; 86) дождж; 87) пяшчота; 88) на вяровачцы; 89) звычка; 90) не вынесла; 91) без клопату; 92) з верасу; 93) адвячорак; 94) параходства; 95) брацкі; 96) сяржант; 97) дзяўчына; 98) збярэшся; 99) не толькі; 100) камандзір.

# МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ

# РЭПЕЦІТАР
# МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ
# АСНОЎНЫЯ СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ СЛОЎ

Тэрмін **“словаўтварэнне”** мае два значэнні: 1) раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца будова вытворных слоў, спосабы і сродкі іх утварэння; 2) працэс утварэння новых слоў паводле пэўных узораў.

Адрозніваюць **марфалагічныя (марфемныя) і немарфалагічныя (немарфемныя)** спосабы словаўтварэння.

Пры **марфалагічным спосабе** асноўным сродкам утварэння слоў з’яўляюцца афіксы (усе марфемы, акрамя каранёвай). Марфалагічнае словаўтварэнне ўключае ў сябе наступныя разнавіднасці афіксацыі:

1) **прыставачнае (прэфіксальнае);**
2) **суфіксальнае;**
3) **прыставачна-суфіксальнае;**
4) **постфіксальнае;**
5) **прыставачна-постфіксальнае;**
6) **суфіксальна-постфіксальнае;**
7) **прыставачна-суфіксальна-постфіксальнае;**
8) **бяссуфікснае;**
9) **прыставачна-бяссуфікснае (прыставачна-нульсуфіксальнае;**
10) **спосабы складання і абрэвіяцыі.**

**Прэфіксальны спосаб –** гэта ўтварэнне новых слоў шляхам далучэння да іх утваральнай прыстаўкі. Найчасцей такім чынам утвараюцца дзеясловы: ***спісаць, выпісаць, запісаць, перапісаць, дапісаць, упісаць.*** Гэты спосаб выкарыстоўваецца і пры ўтварэнні назоўнікаў ( ***беспарадак, водсвет, небяспека),*** прыметнікаў (***звышмагутны, невыразны),*** прыслоўяў (***назаўсёды, залетась, нялёгка).***

**Суфіксальны спосаб –** гэта ўтварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы суфікса (часта разам з канчаткам). З дапамогай разнастайных суфіксаў утвараюцца пераважна назоўнікі і прыметнікі (***песняр, цырульнік, заводскі, масавы).*** Пры ўтварэнні дзеясловаў выкарыстоўваюцца нямногія суфіксы (***гар-
таваць, вітамінізіраваць, важнічаць, дваіць).*** Ролю суфіксаў пры ўтварэнні прыслоўяў адыгрываюць звычайна канчаткі тых часцін мовы, ад якіх гэтыя прыслоўі ўтварыліся (***вечарам, зімою).***

**Для прэфіксальна-суфіксальнага** словаўтварэння характэрна адначасовае далучэнне да ўтваральнай асновы прыстаўкі і суфікса (***за-зім-ак, бяс-хлеб-іц-а, да-школь-н-ы, абяз-лес-і-ць, з-молад-у).***

**Постфіксальны спосаб –** гэта ўтварэнне новых слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы постфіксаў. Так утвараюцца зваротныя дзеясловы (***мыць – мыцца, запомніць – запомніцца),*** займеннікі (***хто – хтосьці, хто-небудзь),*** прыслоўі (***як-небудзь, кудысьці (-сь).***

**Прыставачна-постфіксальны спосаб –** гэта такі спосаб утварэння новых слоў, калі да ўтваральнай асновы адначасова далучаюцца прыстаўка і постфікс. Сустракаецца пры ўтварэнні дзеясловаў (***крычаць – дакрычацца, цярпець – нацярпецца).***

**Суфіксальна-постфіксальны спосаб –** яго сутнасць – у адначасовым далучэнні да ўтваральнай асновы суфікса і постфікса. Сустракаецца пры ўтварэнні дзеясловаў: ***куст – кусц-і-цца, колас – калас-і-цца.***

**Прыставачна-суфіксальна-постфіксальны спосаб –** гэта такі спосаб, калі ў словаўтварэнні адначасова ўдзельнічаюць прыстаўка, суфікс і постфікс. Сустракаецца пры ўтварэнні дзеясловаў: ***гучаць – пера-гук-ва-цца, шчодры – рас-шчодр-ы-цца.***

**Бяссуфіксны спосаб** характарызуецца тым, што словы ўтвараюцца ад іншых не далучэннем афіксаў, а шляхам скарачэння ўтваральнай асновы або далучэннем да яе канчатка (у тым ліку і нулявога): ***марыць – мар-а, малады – моладзь , крычаць – крык*** **Прыставачна-бяссуфіксны спосаб –** так утвараюцца якасныя і адносныя прыметнікі са значэннем ‘не мае таго, што абазначана ўтваральнай асновай’ пры дапамозе прыстаўкі ***без- (бяз-)*** і нулявога суфікса: ***безбароды, бязносы, бязрогі.***

**Спосабы складання і абрэвіацыі.**

- **Асноваскладанне –** спосаб утварэння складанага слова шляхам зліцця дзвюх ці некалькіх асноў (або частак асноў): ***крыгаход --- крыг-а + хадз-і-ць; чарнавокі --- чорн-ы + воч-ы.*** Асноваскладанне характэрна для ўтварэння назоўнікаў, прыметнікаў.

**!** Асновы могуць аб'ядноўвацца злучальнымі галоснымі ***о (а) ці е (я)*** або нулявым афіксам: ***ільновалакно, чарназём, зернефураж, далягляд, Слаўгарад.***

- **Словаскладанне –** словы ўтвараюцца шляхам зліцця двух самастойных слоў у адно: ***штораз, супрацьстаяць, малавядомы, штодзень, глыбокапаважаны, радыёперадача.*** Гэты спосаб выкарыстоўваецца пры ўтварэнні назоўнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў.
- **Асновасловаскладанне –** такі спосаб утварэння слоў, пры якім першая частка ўключае ў сябе толькі ўтваральную аснову, а наступная з'яўляецца цэлым словам: ***праўдападобны --- праўд- + падобны; цёмна-зялёны ---- цёмн- + зялёны.***
- **Складана-суфіксальны спосаб –** гэта асноваскладанне з адначасовым далучэннем суфіксаў: ***аднавясковец ----- адн-а + вёск-а + -овец; добразычлівы ----- дабр-о + зыч-ыць + -лів- + ы.***
- **Абрэвіяцыя –** гэта ўтварэнне складанаскарочаных слоў (абрэвіятур) на базе скарочаных асноў, прычым гэтай базай могуць стаць часткі слоў, асобныя гукі ці нават літары: ***райцэнтр, БелАЗ, БДУ.***

***У залежнасці ад камбінацый базавых элементаў адрозніваюць наступныя тыпы абрэвіятур:***

1) складовыя: ***камбат (камандзір батальёна).*** Яны складаюцца з частак слоў;
2) гукавыя: ***ААН /аан/, НЭП /нэп/;***
3) літарныя: ***ВКЛ /вэкаэл/, БДУ /бэдэу/;***
4) змешаныя: ***БелТА (Беларускае тэлеграфнае агенцтва).***

Нельга змешваць пералічаныя вышэй спосабы ўтварэння слоў у сучаснай мове (так званыя **марфалагічныя,** або **марфемныя,** спосабы**)** са спосабамі, якія вылучаюцца ў гістарычным мовазнаўстве (так званымі **немарфалагічнымі,** або **немарфемнымі,** спосабамі).
**Немарфалагічнае словаўтварэнне** падзяляецца на **марфалагічна-сінтаксічнае, лексіка-сінтаксічнае і лексіка-семантычнае.**

Пад **марфалагічна-сінтаксічным спосабам** словаўтварэння мы разумеем пераход слоў з адной часціны мовы ў другую. Такі пераход абумоўлены зменай сінтаксічнай функцыі слова і адпаведна – яго лексічнага значэння. **Параўнайце:** ***Малы хлопчык засмяяўся (які?). Малы засмяяўся (хто?).***

***Найчасцей адбываюцца такія віды пераходу, як субстантывацыя, ад'ектывацыя і адвербіялізацыя.***

**Субстантывацыя –** пераход прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, займеннікаў у разрад назоўнікаў.

1. ***Дзяжурны вучань прыйшоў першы. – Дзяжурны прыйшоў першы.***
2. ***Ранены салдат заснуў. – Ранены заснуў.***
3. ***Свае людзі заўсёды дапамогуць. – Свае заўсёды дапамогуць.***

**Ад'ектывацыя –** пераход дзеепрыметнікаў у разрад прыметнікаў: ***загарэлы, змораны, гаючы, калючы.***

**Адвербіялізацыя –**пераход склонавых формаў назоўнікаў у прыслоўі (пры гэтым канчаткі становяцца суфіксамі, а прыназоўнікі – прыстаўкамі): ***вечарам, уначы, ноччу, знізу.***

**Лексіка-сінтаксічны тып словаўтварэння –** гэта спосаб зліцця ў адно слова сінтаксічнага словазлучэння з захаваннем парадку слоў і іх склонавых формаў: ***сягоння (сёння) – з сяго дня, трыста (тры ста), нельга (не льга);*** так утварыліся словы ***сёлета, няма, датла і інш.*** У наш час такія словы лічацца невытворнымі, за выключэннем складаных лічэбнікаў тыпу ***дванаццаць, дзвесце.***

**Лексіка-семантычнае словаўтварэнне –** гэта такі спосаб, пры якім слова набывае іншае значэнне, а яго гукавое аблічча пры гэтым не мяняецца. Так узнікаюць амонімы: ***дабро – 'маёмасць' і дабро – 'процілеглае злу'.***

**РЭПЕЦІТАР**
**МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА, СЛОВАЎТВАРЭННЕ**
**ПАЗІЦЫЙНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ЧАРГАВАННІ**

Змены гукаў у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі называюцца **пазіцыйнымі чаргаваннямі.** Ім падлягаюць і галосныя і зычныя.

Сярод пазіцыйных чаргаванняў галосных найбольш пашыраны чаргаванні на аснове акання і якання: ***/о/ - /а/ - новы – навіна, мёд – мядок; /э/ - /а/ - цэгла – цагліна, несці – нясу***

***Пазіцыйныя чаргаванні зычных гукаў адбываюцца пад уплывам суседніх зычных у сярэдзіне слова або залежаць ад становішча на канцы слова. Да іх адносяцца:***

а) чаргаванні звонкіх і глухіх у сярэдзіне слова ў выніку асіміляцыі:
***/б/ - /п/ - рыба - ры/п/ка; /г/ - /х/ - бягу - бе/х/чы; /з/ - /с/ - вазы - ва/с/кі; /д/ - /т/ - лодачка - ло/т/ка; /дз'/ - /ц'/ - дзядзечка - дзя/ц'/ка; /ж/ - /ш/ - стажок - ста/ш/ка;***

***б) чаргаванні звонкіх і глухіх у выніку аглушэння звонкіх на канцы слова: /б/ - /п/ -зубы -зу/п/; /г/ - /х/ -дарога -даро/х/; /з/ - /с/ -вазы -во/с/; /д/ - /т/ - гарады -гора/т/; /дз'/ - /ц'/ - мядзяны – ме/ц'/; /ж/ - /ш/ - нажы – но/ш/; /дж/ - /ч/ - дажджы –дож/ч/;***

***в) чаргаванні цвёрдых і мяккіх зычных у выніку асіміляцыі па мяккасці: /з/ -/з'/ -зносіць -/з'/несці; /с/ -/с'/ - спаў -/с'/піць;***

***г) чаргаванні цвёрдых і мяккіх зычных у выніку змякчэння цвёрдых пры змене формы слова:***
***/т/ -/ц'/ -плата –пла/ц'/іць; /д/ -/дз'/ -улада –ула/дз'/іць; /н/ -/н'/ -сон –у с/н'/е;***
***/л/ -/л'/ -малы –ма/л'/енькі; /м/ -/м'/ -помніць –успа/м'/ін; /п/ -/п'/ -спаць – с/п'/іць;***
***/в/ -/в'/ - лава –на ла/в'/е; /ф/ -/ф'/ -параграф –у парагра/ф'/е; /г/ -/г'/ -вораг – вора/г'/і;***
***/к/ -/к'/ -клетка –клет/к'/і; /х/ -/х'/ -арэх –арэ/х'/і.***

**ВЫКАНАЙЦЕ ЗАДАННЕ САМАСТОЙНА:**

**№ 1. Якія гукі пазіцыйна чаргуюцца ў прыведзеных парах слоў?**

*Лес – ляснік, холад – халодны, дождж – дажджы, лётаць – лётчык; вецер – вятры, вада – вадзіца.*

**№ 2. Вызначце, якія пазіцыйныя чаргаванні могуць адбыцца з выдзеленымі гукамі. Пакажыце на прыкладах.**

*Лі/ч/ыць, цё/т/ка, пе/в'/ень, пра/с'/іць, р/а/брына, ц/а/ляць, ч/о/рны.*

**Гістарычныя чаргаванні** не залежаць ад фанетычнай пазіцыі гука: яны могуць адбывацца, калі гукі стаяць у аднолькавай пазіцыі.

Да самых распаўсюджаных гістарычных чаргаванняў галосных адносяцца **наступныя:**

/**о**/ -/**а**/ -/**э**/ -*граблі –гроб –грэбці*; /**э**/ -/**о**/ -*везці –вёз*; /**э**/ -/**а**/ -*лезці –лазіць*; /**э**/ -/**і**/ -/**о**/ -**нуль гука**: *церці –зацірка –цёр –тру*; /**о**/ -/**у**/ -/**ы**/ -*сохнуць –сухі –высыхаць*; /**і**/ -/**о**/ -**нуль гука**: *біць –бой –б'ю****; /а/ -/у/*** *-вязаць –вузел****; /э/ -/і/*** *-светлы –світаць****; /о/ -/ы/*** *-гром –грыміць.*

Найбольш пашыранымі гістарычнымі чаргаваннямі зычных з’яўляюцца наступныя: а) чаргаванне заднеязычных /г/, /к/, /х/ з шыпячымі: ***/г/ -/ж/*** *-вага –важыць, магу –можаш;* ***/к/ -/ч/*** *-рука –ручка, рака –рэчанька;* ***/х/ -/ш/*** *-мех –мяшок, вуха –вушка;* б) чаргаванне заднеязычных са свісцячымі: ***/г/ -/з’/*** *-дарога –на дарозе****; /к/ -/ц’/*** *-рака –у рацэ****; /х/ -/с’/*** *-страха –на страсе;* в) чаргаванне свісцячых з шыпячымі: ***/дз’/ -/дж/*** *-хадзіць –хаджу****; /ц’/ -/ч/*** *-плаціць –плачу****; /з’/ -/ж/*** *-вазіць –важу;* ***/с’/ - /ш/*** *- насіць – нашу;* г) чаргаванне /д/, /т/ з шыпячымі: /**д**/-/**дж**/ - *хада – хаджу;* /**т**/-/**ч**/ - *плата – плачу;* д) чаргаванне губных (цвёрдых і мяккіх) /**б**/**,** /**в**/**,** /**м**/**,** /**п**/**,** /**ф**/ са спалучэннем гэтых губных з гукам /л’/: /**б**/-/**бл’**/ - *любіць – люблю*; /**п**/-/**пл**/ - *трапіць – траплю*; /**в**/-/**ўл’**/ - *лавіць – лаўлю*; /**м**/- /**мл’**/ - *драмаць – драмлю;* /**ф**/-/**фл’**/ - *графіць – графлю.*

**ВЫКАНАЙЦЕ ЗАДАННЕ САМАСТОЙНА: размяркуйце словы ў слупкі:**

**1) гістарычныя чаргаванні; 2) пазіцыйныя чаргаванні:** ***Бабёр – бабры, вецер – вятрак, лівень – ліўні, кубак – кубкі, бегчы – бяжыць – бег, везці – вязе, вёз – вязу, восем – васьмёра, рука – ручны, хадзіць – хаджу, бровы – брыво, сеяць – сяўба, кроў – крывавы, карміць – кармлю, шэсць – шасцёра, лезці – лазіць, чорны – чарнец, плаціць – плачу; рука – у руцэ.***

**<u>РЭПЕЦІТАР</u>**
**МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ**
**<u>ПАЗІЦЫЙНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ЧАРГАВАННІ</u>**

**АДКАЗЫ**

**<u>№ 1.</u> Якія гукі пазіцыйна чаргуюцца ў прыведзеных парах слоў?**
***Лес – ляснік - /э/:/а/; холад –халады - /о/:/а/, /т/:/д/; дождж – дажджы - /о/:/а/, /ш/:/ж/, /ч/:/дж/; лётаць – лётчык - /т/:/ч/; вецер – вятры - /э/:/а/, /ц'/:/т/; вада – вадзіца - /д/:/дз'/.***

**<u>№ 2.</u> Вызначце, якія пазіцыйныя чаргаванні могуць адбывацца з выдзеленымі гукамі.**
***Лі/ч/ыць - /ч/:/дж/ (лі/дж/ба); цё/т/ка - /т/:/ч/ (цё/ч/чын), /т/:/ц'/ (цё/ц'/я); пе/в'/ень - /в'/:/ў/ (пе/ў/нік); пра/с'/ць - /с'/:/з'/ (про/з'/ба); ч/о/рны - /о/:/а/ (ч/а/рнець); р/а/брына - /а/:/э/ (р/э/бры); ц/а/ляць - /а/:/э/ (пац/э/ліць).***

**<u>№ 1.</u> Размяркуйце словы ў слупкі: 1. Гістарычныя чаргаванні**

**2. Пазіцыйныя чаргаванні**

1. Бабёр – бабры; бегчы – бяжыць – бег; рука – ручны; хадзіць – хаджу; карміць – кармлю; лезці – лазіць; плаціць – плачу; рука – у руцэ; везці – воз.
2. Вецер – вятрак; лівень – ліўні; кубак – кубкі; бровы – брыво; везці – вязе; кроў – крывавы; вёз – вязу; восем – васьмёра; сеяць – сяўба; шэсць – шасцёра; чорны – чарнець.

# ПЛАНЫ-АЛГАРЫТМЫ
# ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ
# МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ
# АСНОЎНЫЯ СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ СЛОЎ

**Заданне 1. Адзначце словы, якія маюць у сваім саставе прыстаўку і суфікс (суфіксы):**
1) прамяністы; 2) пабіты; 3) адважны, 4) крывадушнасць; 5) звонку.

**Ход разважання.** Каб правільна вызначыць будову слова, наяўнасць у ім прыстаўкі і суфікса, трэба:
- падабраць аднакаранёвыя словы, што дазволіць знайсці агульную частку, або корань, і вызначыць іншыя марфемы;
- памятаць, што падбіраць роднасныя словы трэба не па знешнім падабенстве, а па агульнасці іх лексічнага значэння: нельга да слова ***адважны*** ў якасці роднасных падабраць словы ***важны, вага,*** бо паводле лексічнага значэння яны не роднасныя са словамі ***адвага, адважны, адважнасць;***
- ведаць, што ў складаным слове, утвораным шляхам аб'яднання дзвюх асноў, як правіла, прыстаўкі няма: ***крывадушнасць.***

**Адказ: 2, 5**

**Заданне 2. Адзначце словы. структура якіх адпавядае схеме:** *корань + суфікс + канчатак:*
1) медальён; 2) выточваць; 3) медны; 4) выдатна; 5) заняты.

**Ход разважання.** У дадзеным заданні неабходна вылучыць словы, якія ўтвораны суфіксальным спосабам, для гэтага неабходна памятаць:
- суфіксальны спосаб – гэта ўтварэнне слоў шляхам далучэння да утваральнай асновы суфікса;
- з дапамогай разнастайных суфіксаў утвараюцца пераважна назоўнікі і прыметнікі: ***медальён, медны, заняты;***
- ролю суфіксаў пры ўтварэнні прыслоўяў адыгрываюць звычайна канчаткі, а само прыслоўе канчатка не мае: ***выдатна.***

**Адказ: 1, 3, 5.**

**Заданне 3. Адзначце словы, структура якіх адпавядае схеме:** *прыстаўка + корань+ суфікс:*
1) заводскі; 2) небакрай; 3) надоўга; 4) асіннік; 5) замнога.

**Ход разважання.** Для таго каб правільна выканаць гэта заданне неабходна
- знайсці нязменныя часціны мовы: прыслоўе, форму дзеяслова – інфінітыў, форму дзеяслова – дзеепрыслоўе, так як яны у сваёй будове не маюць канчатка: ***надоўга, замнога;***
- вызначыць ад якога слова яны утварыліся: ***надоўга – доўга; замнога – многа.***

**Адказ: 3, 5.**

**Заданне 4. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:**
1) па-гаспадарску; 2) пагроза; 3) дробны; 4) паўторна; 5) маралiст.

**Ход разважання.** Для выканання задання неабходна:
- вызначыць у словах корань (падабраць аднакаранёвыя словы), прыстаўку (частка асновы, якая знаходзіцца перад коранем і служыць для ўтварэння новых слоў або іх формаў), суфікс (частка асновы слова, якая знаходзіцца пасля кораня і служыць для ўтварэння новых слоў або іх формаў), канчатак (зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе).

**<u>Заўвага!</u>** Трэба распазнаваць нулявы канчатак у зменных словах: ***маралiст*** і памятаць пра адсутнасць канчаткаў ў нязменных словах: ***па-гаспадарску, паўторна.***

**Адказ: 3, 5**

**ПЛАНЫ-АЛГАРЫТМЫ**
**ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ**
**МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ**
**ПАЗІЦЫЙНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ЧАРГАВАННІ**

**Заданне 1. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні меснага склону адзіночнага ліку адбываецца змена апошняга зычнага асновы:**

1) бінт; 2) блок; 3) скруха; 4) паслуга; 5) педагог.

**Ход разважання.** Для выканання задання неабходна ведаць, што:

- пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца змена апошняга зычнага асновы назоўнікаў ***бінт, скруха, паслуга*: *аб бінце, скрусе, паслузе;***
- апошні зычны асновы назоўнікаў ***блок, педагог*** пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку не змяняецца: ***аб блоку, педагогу.***

**Адказ: 1, 3, 4**

**Заданне 2. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы адзіночнага ліку меснага склону адбываецца чаргаванне зычных:**

1) увага; 2) пошук; 3) хустка; 4) айсберг; 5) жах.

У заданне ўключаны назоўнікі, аснова якіх заканчваецца на заднеязычны гук.

Для выканання задання трэба памятаць наступнае:

- у назоўніках ***увага, хустка*** пры ўтварэнні формы адзіночнага ліку меснага склону адбываецца змена зычных у аснове, у выніку ўзнікаюць чаргаванні тыпу: [**г**] – [**з'**] (***увага – на ўвазе),*** [**к**] – [**ц**] (***хустка – у хустцы);***
- у назоўніках ***пошук, айсберг, жах*** такога чаргавання ў аснове не адбываецца: ***на айсбергу, у пошуку, у жаху.***

**Адказ: 1, 3**

**Заданне 3. Адзначце словы, пры змяненні якіх адбываецца беглаць галосных *(чаргаванне [о], [э] з нулём гука):***

1) луг; 2) станок; 3) сон; 4) бусел; 5) вёска.

Для таго, каб правільна выканаць дадзенае заданне неабходна памятаць:

- выпадзенне галоснага пры змяненні адбываецца ў словах з суфіксам ***–ок-: станок – станка;***
- пры змяненні слоў ***сон і бусел*** таксама адбудзецца выпадзенне галоснага: ***сон – сну***; ***бусел – бусла.***

**Адказ: 2, 3, 4**

**ВЫКАНАЙЦЕ ТЭСТАВАЕ ЗАДАННЕ САМАСТОЙНА**

**Заданне 1. Адзначце словы, пры змяненні якіх адбываецца беглаць галосных *(чаргаванне [о], [э], [а] з нулём гука):***

1) ноч; 2) майстар; 3) снег; 4) дзянёк; 5) замок.

**Заданне 2. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца чаргаванне зычных у аснове:**

1) казка; 2) заслуга; 3) подых; 4) пачатак; 5) блакіт.

**Заданне 3. Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне зычных гукаў:**

1) дасягненні (навука); 2) скакаць на дзвюх (нозі); 3) радавацца (адзнака); 4) ісці па (бераг); 5) у правай (рука).

**ПАМЯТАЙЦЕ: чаргаванне зычных – з'ява старажытная. Яна склалася на аснове тых фанетычных працэсаў, якія адбываліся ў старажытнай беларускай мове і ў сучаснай мове сталі традыцыяй. Справіцца з заданнем можна, калі вы маеце такія словы ў сваім актыўным слоўнікавым запасе і свабодна карыстаецеся іх склонавымі формамі.**

**КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ**
**ТЭМАТЫЧНЫЯ МІКРАСХЕМЫ**
**МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ**
**ПАЗІЦЫЙНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ЧАРГАВАННІ**

Пры выкананні задання на чаргаванні галосных і зычных гукаў неабходна памятаць, што чаргаванне адбываецца пры змяненні і ўтварэнні слоў у каранях: *луг – лужок – на лузе.* **Чаргаванне –** змена гукаў ў адной і той жа марфеме роднасных слоў ці ў розных формах таго самага слова. Чаргавацца могуць і галосныя, і зычныя гукі. Найбольш пашыраныя наступныя **чаргаванні галосных:**

[**о**] - [а]: *горад – гарады, сёстры – сястра;*
[э] - [а]: *цэгла – цагляны, лес – лясны;*
[э] - [і]: *свет – світанак, кветка – квітнець;*
[э] - [а]: *несці – насіць – носіць;*
[о] - [у] – [ы]: *сохнуць – сухі – засыхаць;*
[о] - [і] – [э] – [а]: *збор – збіраць – выберу – забяру;*
[о] - нуль гука: *сон – сну;*
[э] - нуль гука: *дзень – дні.*

У некаторых словах чаргуюцца склады [ро] - [ры], [ло] - [лы], [ле (ля)] - [лі]: *гром – грымоты, глотка – глытаць, блеск(бляск) – блішчэць.*

У беларускай мове сустракаюцца наступныя **чаргаванні зычных:**
[г] - [ж] - [з']: *нага – ножка – на назе;*
[х] - [ш] - [с']: *страха – стрэшка – на страсе;*
[к] - [ч] - [ц]: *рака – рэчка – на рацэ;*
[з] - [ж]: *вязаць - вяжу, казаць – кажу;*
[с], [с'] - [ш]: *пісаць – пішу, касіць – кашу;*
[д] - [дз'] - [дж]: *хада – хадзіць – хаджу;*
[т] - [ч] - [ц']: *свет – свячу – свяціць;*
[ст] - [шч]: *рост – вырошчваць, мост – намошчаны;*
[ск], [ск'] - [шч]: *паласкаць - палашчу; плоскі – плошча;*
[б'] - [бл'], [п] - [пл']: *любіць – люблю, сыпаць – сыплю;*
[м'] - [мл'], [в'] - [ўл']: *карміць – кармлю, лавіць – лаўлю.*

Акрамя названых чаргаванняў, вы павінны памятаць пра чаргаванні цвёрдага ***д*** з мяккім ***дз',*** цвёрдага ***т*** з мяккім ***ц'****: горад – у горадзе, плот – на плоце,* а таксама іншых цвёрдых зычных з мяккімі.

**ПРАКТЫКАВАННЕ ДЛЯ ЗАМАЦАВАННЯ**

*Змяніце словы або падбярыце для іх роднасныя, каб паказаць усе магчымыя чаргаванні ў каранях. Запішыце словы і падкрэсліце галосныя і зычныя, якія чаргуюцца.*

Смех, гром, бераг, ветлівы, дрэва, ляпіць, воск, свет, рука, вока, дарога, прывыкнуць, прасіць, парта, кветка, крок, жоўты, вёска, змрок, малады, перамога, кроў, навука, дровы, цвет.

# <u>КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ: РЫХТУЕМСЯ ДА ЭКЗАМЕНА</u>
# <u>МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ</u>
# <u>МАРФЕМНАЯ СТРУКТУРА СЛОВА.</u>
# <u>АСНОЎНЫЯ СПОСАБЫ СЛОВАЎТВАРЭННЯ</u>

## ЗАДАННІ

**<u>№1.</u> Вызначце у словах утваральныя асновы.**
***Прыгарад, прыгарадны; каса, касец; ваенны, даваенны; марскі, прыморскі; садовы, садоўнік.***

**<u>№ 2.</u> Вызначце марфемную будову і спосабы ўтварэння слоў.**
***Марскі, жалезны, мара, запіс, узлесак, прыход, бяззубы, няшчыра, пераплётчык, падзяка, дарослы.***

**<u>№ 3.</u> Размяркуйце ў слупкі словы паводле спосабу іх утварэння.**
***Светла-зялёны, вечназялёны, сінявокі, белагрывы, зернясклад, мімаволі, плпшч-палатка, плытагон, левабярэжжа, штораз, малаверагодны, часопіс, летапіс, завод-аўтамат, стогалосы, інжынер-канструктар.***

| <u>**Асноваскладанне:**</u> | <u>**Словаскладанне:**</u> |
|---|---|

**<u>№ 4.</u> Вызначце, якім спосабам – суфіксальным ці складана-суфіксальным – утвораны словы. Размяркуйце словы ў слупкі.**
***Бульбакапалка, аднакласнік, добраахвотнік, добрасумленнасць, двухстволка, вадакачка, двухпакаёвы, ціхаакіянскі, двухтомны, танкасценны, баяздольнасць, пласкагор'е, чатырохпавярховы, узаемаабумоўленасць.***

| <u>**Суфіксальны спосаб:**</u> | <u>**Складана-суфіксальны спосаб:**</u> |
|---|---|

**<u>№ 5.</u> Запішыце поўныя назвы, адпаведныя абрэвіятурам.**
А) АН, НТР, ЛіМ, НДІ, ДАІ, МТЗ, ЦУМ, ЭВМ, ВНУ, СЭС;
Б) гарсавет, загс, камбат, гарана, прафсаюз, райцэнтр, лясгас, калгас, медінстытут, абком.

**<u>№ 6.</u> Падкрэсліце словы, якія перайшлі ў іншую часціну мовы.**
***Нашы перамаглі – нашы суседзі, смелы паляўнічы – паляўнічы нож, наступнае выданне – дзверы ў наступнае, з апошнім рублём – дзяліцца апошнім, прыйду ноччу – дыхаю гэтай ноччу, назва ў гары незвычайная – недзе ўгары, стары ўспамінае былое – стары чалавек успамінае былое жыццё, чалавек быў свой – свой не здрадзіць, сталовая талерка – наша сталовая.***

**<u>№ 7.</u> Выпішыце з тэксту словы з вытворнай асновай, абазначце марфемы.**
***Дзядуля ішоў ад хвойкі да хвойкі, лёгка пастукваў па іх абушком, па адной – раз, па другой – два ці тры. Абстукаў больш за дзесяць, роўных і няроўных.***

**<u>№ 8.</u> Растлумачце, якім спосабам утвораны наступныя словы.**
***Працавіты, нарукаўнік, Салігорск, моладзь, баравік, летапіс, цеплыня, падагнаць, бязмежны, трактарыст, прабабка.***

**<u>№ 9.</u> Зрабіце марфемны разбор наступных слоў.**
***Бесказырка, далёка, грыбнікі, магутны, збіраліся, здабываючы, неразлучныя, адкаціць, вольная, спрактыкаваны, вольніца, краявід, настаўніца, чаканне, падтрымаць.***

**<u>№ 10.</u> Зрабіце словаўтваральны разбор наступных слоў.**
***Перавыдаць, асцярожна, беражлівасць, чырвань, чорнавалосы, дзяжурны, сябраваць, пралеска, пераспелы, зямлянка, адважны.***

## ТЭСТАВЫ МАТЭРЫЯЛ ПА ТЭМЕ «МАРФЕМНАЯ СТРУКТУРА СЛОВА. АСНОЎНЫЯ СПОСАБЫ ЎТВАРЭННЯ СЛОЎ»

**1. Адзначце словы з невытворнай асновай:**
1) цікавасць; 2) граматны; 3) дзядуля; 4) вясна; 5) дзюба.

**2. Адзначце словы, марфемная будова якіх адпавядае схеме *прыстаўка* + *корань* + *суфікс:*** 1) заводскі; 2) небакрай; 3) надоўга; 4) асіннік; 5) узняўшы.

**3. Адзначце словы, марфемная будова якіх адпавядае схеме *корань* + *суфікс:***
1) міла; 2) гладзь; 3) назіраў; 4) чытаю; 5) падобна.

**4. Адзначце словы, марфемная будова якіх адпавядае схеме *прыстаўка* + *корань* + *канчатак:*** 1) па-птушынаму; 2) піяністка; 3) падтэкст; 4) замок; 5) праполка.

**5. Адзначце рады аднакаранёвых (роднасных) слоў:**
I. - 1) вячэрні, адвячорак, вечаровы; 2) родны, роднага, родным; 3) падсініць, сінь, сіняваты; 4) бясхмарны, хмарыцца, хмара; 5) пазыка, пазычаць, пазыўны.
II. – 1) груз, пагрузка, выгружаны; 2) вага, узважыць, вагон; 3) водны, воднага; водным; 4) барада, безбароды, барадаты; 5) рачны, рэчанька, прырэчны.

**6. Адзначце словы з нулявым канчаткам:**
1) шчыра; 2) край; 3) моладзь; 4) уверсе; 5) злёгку.

**7. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:**
1) імпэтна; 2) зацішак; 3) змоладу; 4) прыазёрны; 5) насенне.

**8. Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць *прыстаўку:***
1) дасціпны; 2) растрата; 3) абаротлівы; 4) зноска; 5) абамлелы.

**9. Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць суфікс (суфіксы):**
1) айчынны; 2) аптэка; 3) малацьба; 4) заняў; 5) акцёр.

**10. Адзначце словы, якія ў сваім саставе маюць суфікс (суфіксы):**
1) званар; 2) хваліў; 3) пільны; 4) маланка; 5) дачыста.

**11. Адзначце словы з наступнай марфемнай будовай: *прыстаўка* + *корань* + *суфікс* + *суфікс* + *канчатак:***
1) існаванне; 2) уседлівасць; 3) навечна; 4) падпяваў; 5) зляжалы.

**12. Адзначце словы з вытворнай асновай:**
1) гонар; 2) ліцэіст; 3) весела; 4) акно; 5) ехаў.

**13. Адзначце словы, якія маюць у сваім саставе *прыстаўку і суфікс (суфіксы):***
1) заходні; 2) няцвёрда; 3) дагадзіць; 4) чарнаморскі; 5) упустую.

**14. Адзначце словы з аднолькавай марфемнай будовай:**
1) па-братняму; 2) павольна; 3) пяцёрка; 4) чорны; 5) адчыняючы.

**15. Адзначце словы, утвораныя бессуфіксальным спосабам:**
I. – 1) вываз; 2) смеласць; 3) выдых; 4) хвала; 5) хваравіта.
II. – 1) прылёт; 2) чырвоны; 3) клятва; 4) заплыў; 5) скрып.

**16. Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам:**
1) шырыня; 2) блізка; 3) цёплы; 4) спераду; 5) зімовыя.

**17. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:**
1) скрычацца; 2) зблізку; 3) збор; 4) узаконіць; 5) аднавясковец.

**18. Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:**
1) непарадак; 2) упоцемку; 3) зборны; 4) збочыць; 5) ніхто.

**19. Адзначце нумары радкоў, у якіх абодва словы ўтвораны аднолькавым спосабам:** 1) таўстацелы, мяккасардэчны; 2) закаваць, наднацыянальны;
2) калгас, звышлімітны; 4) вушанка, перамешванне; 5) надпіс, гаючы.

***20.* Адзначце словы, структура якіх адпавядае схеме: *прыстаўка* + *корань* + *суфікс:*** 1) падаўна; 2) пакаты; 3) выпечка; 4) выгадна; 5) запаведнік.

## МАРФЕМНАЯ СТРУКТУРА СЛОВА.
## АСНОЎНЫЯ СПОСАБЫ СЛОВАЎТВАРЭННЯ

***АДКАЗЫ***

*№ 1. Вызначце у словах утваральныя асновы.*

***Прыгарад --- горад, прыгарадны --- прыгарад; каса --- кас-іць, касец --- кас-і-ць; ваенны --- вайн-а, даваенны --- вайн-а; марскі --- мор-а, прыморскі --- мор-а; садовы --- сад, садоўнік --- садов-ы.***

*№ 2. Вызначце марфемную будову і спосабы ўтварэння слоў.*

***Марск і --- мор-а (суфіксальны спосаб), жалезн ы --- жалез-а (суф.), мар а --- марыць (бяссуфіксны), запіс --- запісаць (бяссуф.), узлесак --- лес (прыставачна-суфіксальны), прыход --- прыходзіць (бяссуф.), бяззуб ы --- зуб (прыст.-бяссуф.), няшчыра --- шчыра (прыставачны), пераплётчык --- пераплятаць (суфікс.), падзяк а --- падзякаваць (бяссуфіксны), даросл ы --- дарасці (суфікс.).***

*№ 3. Размяркуйце ў слупкі словы паводле спосабу іх утварэння.*

| *Асноваскладанне:* | *Словаскладанне:* |
|---|---|
| ***светла-зялёны*** | ***вечназялёны*** |
| ***сінявокі*** | ***мімаволі*** |
| ***белагрывы*** | ***плашч-палатка*** |
| ***зернясклад*** | ***штораз*** |
| ***плытагон*** | ***малаверагодны*** |
| ***левабярэжжа*** | ***завод-аўтамат*** |
| ***часопіс*** | ***інжынер-канструктар*** |
| ***летапіс*** | |
| ***стогалосы*** | |

*№ 4. Вызначце, якім спосабам – суфіксальным ці складана-суфіксальным – утвораны словы. Размяркуйце словы ў слупкі.*

| *Суфіксальны спосаб:* | *Складана-суфіксальны спосаб:* | |
|---|---|---|
| ***добраахвотнік*** | ***бульбакапалка*** | ***двухпакаёвы*** |
| ***добрасумленнасць*** | ***аднакласнік*** | ***ціхаакіянскі*** |
| ***баяздольнасць*** | ***вадакачка*** | ***танкасценны*** |
| ***узаемаабумоўленасць*** | ***двухстволка*** | ***пласкагор'е*** |
| | ***двухтомны*** | ***чатырохпавярховы*** |

*№ 5. Запішыце поўныя назвы, адпаведныя абрэвіятурам.*

***А) АН – Акадэмія навук, НТР – навукова-тэхнічная рэвалюцыя, ЛіМ – газета "Літаратура і мастацтва", НДІ – навукова-даследчы інстытут, ДАІ – Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя, МТЗ – Мінскі трактарны завод, ЦУМ – цэнтральны універсальны магазін, ЭВМ – электронна-вылічальная машина, ВНУ – вышэйшая навучальная ўстанова, СЭС – санітарна-эпідэміялагічная станцыя.***

***Б) гарсавет – гарадскі савет, загс – аддзел запісаў актаў грамадзянскага стану, камбат – камандзір батальёна, гарана – гарадскі аддзел народнай адукацыі, прафсаюз – прафесійны саюз, райцэнтр – раённы цэнтр, лясгас – лясная гаспадарка, калгас – калектыўная гаспадарка, медінстытут – медыцынскі інстытут, абком – абласны камітэт.***

*№ 6. Падкрэсліце словы, якія перайшлі ў іншую часціну мовы.*

***Нашы перамаглі, смелы паляўнічы, дзверы ў наступнае, дзяліцца апошнім, прыйду ноччу, недзе ўгары, стары ўспамінае былое, свой не здрадзіць, наша сталовая.***

**ТЭСТ: 1** – 4, 5; **2** – 3, 5; **3** – 1, 5; **4** – 3, 4; **5** – **I.** – 1, 3, 4; **II.** – 1, 4, 5; **6** – 2, 3; **7** – 2, 4; **8** – 2, 4, 5; **9** – 1, 3, 4; **10** – 1, 2, 5; **11** – 2, 4, 5; **12** – 2, 3, 5; **13** – 2, 3, 5; **14** – 1, 5; **15** – **I.** – 1, 3, 4; **II** – 1, 4, 5; **16** – 1, 2, 5; **17** – 1, 2, 4; **18** – 1, 5; **19** – 2, 4; **20** – 1, 2.

## КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ: РЫХТУЕМСЯ ДА ЭКЗАМЕНА
## МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ
## ПАЗІЦЫЙНЫЯ І ГІСТАРЫЧНЫЯ ЧАРГАВАННІ

**1. Адзначце назоўнікі, у аснове якіх пры ўтварэнні формы адзіночнага ліку меснага склону адбываецца чаргаванне зычных:**

**1** – 1) засуха; 2) агарод; 3) Алёнка; 4) агрэх; 5) мурог.
**2 -** 1) будаўнік; 2) круг; 3) рака; 4) Калуга; 5) жах.
**3 -** 1) плуг; 2) верх; 3) размах; 4) флот; 5) заапарк.
**4 -** 1) рэха; 2) кветка; 3) мост; 4) пуга; 5) гара.
**5 -** 1) луг; 2) чытач; 3) газета; 4) старонка; 5) падарожжа.
**6 -** 1) мяжа; 2) бераг; 3) друк; 4) дачка; 5) перапалох.
**7 -** 1) рака; 2) лагер; 3) зямля; 4) балота; 5) трывога.
**8 -** 1) мястэчка; 2) сажалка; 3) слых; 4) раз’езд; 5) універсітэт.
**9 -** 1) палонка; 2) секунда; 3) друк; 40 дапамога; 5) трыснёг.
**10** – 1) трывога; 2) росчырк; 3) планета; 4) вуха; 5) лейка.

**2. Адзначце дзеясловы, у аснове якіх пры ўтварэнні формы 1-й асобы адзіночнага ліку абвеснага ладу цяперашняга часу адбываецца чаргаванне зычных:**

**1 -** 1) хвастаць; 2) ездзіць; 3) драмаць; 4) шаптаць; 5) лічыць.
**2 -** 1) ляцець; 2) гарэць; 3) шумець; 4) насіць; 5) звінець.
**3 -** 1) маўчаць; 2) вадзіць; 3) важыць; 4) глядзець; 5) свяціць.

**3. Адзначце назоўнікі, у якіх пры ўтварэнні формы меснага склону адзіночнага ліку адбываецца змена апошняга зычнага асновы:**

**1 -** 1) адліга; 2) вечарынка; 3) кракавяк; 4) рост; 5) бацька.
**2 -** 1) вожык; 2) абляпіха; 3) рэха; 4) частка; 5) провад.
**3 -** 1) задуха; 2) смык; 3) перасцярога; 4) горад; 5) подзвіг.
**4 -** 1) продак; 2) скарга; 3) міска; 4) шлях; 5) далягляд.
**5 -** 1) лаўка; 2) біклага; 3) аншлаг; 4) ласунак; 5) торт.
**6 -** 1) промах; 2) перавага; 3) запіска; 4) паварот; 5) бляск.
**7 -** 1) бінт; 2) блок; 3) скруха; 4) паслуга; 5) педагог.
**8 -** 1) бібліятэка; 2) блакіт; 3) пачатак; 4) заўвага; 5) працяг.
**9 -** 1) подых; 2) білет; 3) дыск; 4) заслуга; 5) качка.

**4. Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы адбываецца чаргаванне зычных гукаў:**

**1 -** 1) трава на (луг); 2) ласавацца (гарох); 3) расці пры (сцежка); 4) у госці да (цётка); 5) выпечка з (мука).
**2 -** 1) поспехі ў (навука); 2) стаяць на (ганак); 3) радавацца (адзнака); 4) зваліцца з (лаўка); 5) трава з (луг).
**3 -** 1) стаяць на (мост); 2) скакаць з (кладка); 3) ляжаць пад (лаўка); 4) бегчы па (дарожка); 5) сядзець на (куст).
**4 -** 1) звісаць з (дуга); 2) з новай (эпоха); 3) стаяць пры (дарога); 4) ісці па (кладка); 5) ехаць па (мост).
**5 -** 1) дасягненні (навука); 2) скакаць на дзвюх (ногі); 3) радавацца (адзнака); 4) ісці па (бераг); 5) у правай (рука).

**5. Адзначце словы, у якіх пры змяненні адбываецца бегласць галосных (чаргаванне [о], [э], [а] з нулём гука):**

**1 -** 1) колас; 2) бабёр; 3) арол; 4) горад; 5) рука.
**2 -** 1) ноч; 2) майстар; 3) снег; 4) дзянёк; 5) замок.
**3 -** 1) луг; 2) станок; 3) сон; 4) бусел; 5) вёска.

# МАРФАЛОГІЯ
# І
# КУЛЬТУРА
# МАЎЛЕННЯ

# РЭПЕЦІТАР
# МАРФАЛОГІЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ: ДЗЕЯСЛОЎ І ЯГО ФОРМЫ
# СПРАЖЭННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ.
# ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ

У цяперашнім і будучым часе асабовыя формы дзеясловаў утвараюцца пры дапамозе канчаткаў:

| **Асоба** | **І спражэнне** | | **ІІ спражэнне** | |
|---|---|---|---|---|
| | **адз. л.** | **мн. л.** | **адз. л.** | **мн. л.** |
| **І-я, мы** | ***-у, -ю*** | ***-ём, -ом, -ем, -ам*** | ***-у, -ю*** | ***-ім, -ым*** |
| **ІІ-ты, вы** | ***-еш, -эш, -аш*** | ***-еце,-аце -аце, -ацё, -яце, -яцё*** | ***-ім, -ым*** | ***-іце, -ыце*** |
| **ІІІ-ён, яны** | ***-е, -э, -а*** | ***-уць, -юць*** | ***-іць, -ыць*** | ***-аць, яць*** |

Спражэнне можна вызначыць па інфінітыве: ІІ спр. – 1) на іць, ыць: *любіць, касіць, смажыць.* **Выключэнне:** аднаскладовыя дзеясловы: *мыць, шыць, біць.*
2) дзеясловы *ненавідзець, цярпець, гнаць, залежаць, дрыжаць.* І спр. – усе астатнія. Дзеясловы *бегчы, есці, даць* – рознаспрагальныя.
Напісанне галосных у асабовых канчатках дзеясловаў падпарадкоўваецца агульнаму правілу.

**<u>Алгарытм вызначэння канчаткаў дзеясловаў 1, 2 асобы мн. л.</u>**

1. Упэўніся ў тым, што ад дадзеных дзеясловаў можна ўтварыць форму пэўнага часу. Для гэтага вызначы трыванне дзеясловаў, памятай, што цяперашні час утвараецца толькі ад дзеясловаў незакончанага трывання, а будучы – ад дзеясловаў закончанага трывання.

**<u>Напрыклад,</u>** *лезці –нез. тр., занядбаць – зак. тр., паставіць – зак. тр.,*
ад першага дзеяслова нельга ўтварыць будучы час.

2. Вызначы спражэнне дзеясловаў.

**<u>Напрыклад,</u>** *лезці – яны лезуць (І спр.), занядбаць – яны занядбаюць (І спр.), паставіць – яны паставяць (ІІ спр.).*

3. Змяні дзеяслоў па пэўнай асобе. Пры гэтым асобую ўвагу звяртай на канчаткі 1, 2 асобы мн. л., бо яны залежаць ад месца націску. Значыць, вызначы націскны ці ненаціскны канчатак.

**<u>Напрыклад,</u>** *лезці – яны лезуць (ненац.), занядбаць – яны занядбаюць (ненац.), паставіць – яны паставяць (ненац.), жыць – яны жывуць (нац.).*

4. Памятай, што 1-я асоба мн. л. - **мы** мае канчаткі ***–ом,-ём*** –пад націскам, ***-ам,-ем*** **–** не пад націскам, 2-я асоба мн. л. – **вы** мае канчаткі – ***аце,-ацё,-яце,-яцё*** – пад націскам, ***-аце,-еце*** **–** не пад націскам – **<u>гэта для дзеясловаў І спражэння.</u>**
   1-я асоба мн. л. – **мы** мае канчаткі ***–ім,-ым,*** 2-я асоба мн. л.- **вы** мае канчаткі ***–іце, ыце*** незалежна ад націску – **<u>гэта для дзеясловаў ІІ спражэння.</u>**

**<u>Напрыклад,</u>** *жыць –І спр., яны жывуць – нац. канчатак, вы жывяце, мы жывём. Пісаць – І спр., яны пішуць – ненац. канчатак, вы пішаце, мы пішам. Паглядзець – ІІ спр., яны паглядзяць – нац. канчатак, вы паглядзіце, мы паглядзім. Ненавідзець – ІІ спр., яны ненавідзяць – ненац. канчатак, вы ненавідзі*
*це, мы ненавідзім.*

**<u>ВЕДАЙ! Ёсць двухтрывалыя дзеясловы: *імправізаваць.* Ёсць рознаспрагальныя дзеясловы: *бегчы, есці, даць.*</u>**

# ПЛАНЫ-АЛГАРЫТМЫ
# ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ
# МАРФАЛОГІЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ:
# ДЗЕЯСЛОЎ І ЯГО ФОРМЫ
# ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

**Заданне 1. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга (будучага) часу маюць канчатак *–уць, -юць.***
2) думаць; 2) зычыць; 3) агледзець, 4) есці; 5) праходзіць.
**Ход разважання.** Вызначым спачатку трыванне дзеясловаў: 1, 2, 4 –дзеясловы незакончанага трывання; 3, 5 – дзеясловы закончанага трывання. Значыць, ад першай групы будзем утвараць форму цяперашняга часу, а ад другой – форму будучага часу. Цяпер вызначым спражэнне 1 – Іспр., 2, 3, 5 – ІІ спр., 4 – рознаспрагальны. Канчатак – ***уць,-юць*** у 3-й асобе мн. л. маюць дзеясловы І спр. і рознаспрагальныя дзеясловы.
**Адказ: 1,4.**

**Заданне 2. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца з канчаткамі *–іце,-ыце* ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу.**
2) мякчэць; 2) шумець; 3) тлець; 4) сядзець; 5) грэць.
**Ход разважання.** Вызначым спачатку трыванне дзеясловаў: усе дзеясловы незакончанага трывання. Значыць, ад усіх іх можна ўтварыць форму цяперашняга часу. Цяпер вызначым спражэнне дзеясловаў: 1, 3, 5 – І спр., 2, 4 – ІІ спр. Канчатак ***–іце,-ыце*** ў 2-й асобе мн. л. маюць дзеясловы ІІ спр.
**Адказ: 2, 4.**

**Заданне 3. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца з канчаткамі – *аце,-яце* ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу.**
2) класці; 2) успомніць; 3) цярпець; 4) жаць; 5) рэзаць.
**Ход разважання.** Вызначым спачатку трыванне дзеясловаў: 1, 3, 4, 5 дзеясловы незакончанага трывання, 2 – закончанага трывання. Значыць, ад другога дзеяслова нельга ўтварыць форму цяперашняга часу. Цяпер вызначым спражэнне дзеясловаў: 1, 4, 5 – І спр., 3 – ІІ спр. Канчатак ***–аце*** маюць дзеясловы І спр. з націскным і ненаціскным канчаткам, а ***–яце*** – дзеясловы І спр. з націскным канчаткам. Вызначым, куды падае націск у дзеясловах І спр.: *яны кладуць, яны жнуць* – на канчатак, *яны рэжуць* – на аснову, але аснова на зацвярдзелы зычны, значыць, будзе канчатак ***–аце.***
**Адказ: 1, 4, 5.**

**Заданне 4. Адзначце дзеясловы, якія ўжываюцца ў форме 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга ці будучага часу з канчаткамі *–еш,-еце.***
2) ты (чакаць) званка; 2) вы (рабіць) паслугу; 3) вы (наведваць) хворага;
4) ты (непакоіцца) пра бабулю; 5) ты (даручыць) сябру.
**Ход разважання.** Канчатак ***–еш,-еце*** ў форме 2-й асобы маюць дзеясловы І спр.
Вызначым, якія з дадзеных дзеясловаў, з'яўляюцца дзеясловамі І спр. Гэта 1, 3.
Цяпер трэба праверыць аснову і размяшчэнне націску, для 2-й асобы мн. л. Першы дзеяслоў трэба змяніць у адз. л. , аснова дзеяслова на галосны, значыць, будзе канчатак – ***еш;*** трэці дзеяслоў трэба змяніць у мн. л., націск падае на аснову, аснова на галосны, значыць, будзе канчатак ***–еце.***
**Адказ: 1, 3.**

# КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ: ТЭМАТЫЧНЫЯ МІКРАСХЕМЫ

## ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

**Асоба** паказвае, хто з'яўляецца вытворцам дзеяння. Дзеяслоў мае формы трох асоб адзіночнага і множнага ліку.

Формы **1-й асобы** абазначаюць дзеянне таго, хто гаворыць. З імі суадносяцца займеннікі ***я, мы: чытаю, зраблю, чытаем, зробім.***

Формы **2-й асобы** абазначаюць дзеянне таго, дакаго звяртаюцца. З гэтымі формамі суадносяцца займеннікі ***ты, вы: чытаеш, зробіш, чытаеце, зробіце.***

Формы **3-й асобы** абазначаюць дзеянне таго, пра каго або пра што ідзе размо ва. З імі суадносяцца займеннікі ***ён (яна, яно)*** і ***яны: чытае, зробіць, чытаюць, зробяць.***

Існуе два тыпы спражэння – **першае і другое.** Зручней за ўсё адрозніваць дзеясловы першага спражэння ад дзеясловаў другога спражэння па канчатках
3-й асобы множнага ліку абвеснага ладу: дзеясловы першага спражэння маюць канчаткі – **уць (-юць):** *нясуць, полюць;* дзеясловы другога спражэння – канчаткі **–аць (-яць):** *бачаць, сядзяць.*

Да другога спражэння адносяцца дзеясловы, якія ў інфінітыве заканчваюцца на **–іць, -ыць** *(насіць, вучыць),* за выключэннем аднаскладовых тыпу *біць, шыць, крыць,* а таксама дзеясловы *гнаць, цярпець, вярцець, ненавідзець.*

**Асабовыя канчаткі дзеясловаў другога спражэння**

| **лік** | **асоба** | **на мяккі, націск на аснове** | **на мяккі, націск на канчатку** | **на зацвярдзел., націск на аснове** | **на зацвярдзел., націск на канчатку** |
|---|---|---|---|---|---|
| адз. | 1 | *хвалю* | *стаю* | *бачу* | *маўчу* |
| адз. | 2 | *хваліш* | *стаіш* | *бачыш* | *маўчыш* |
| адз. | 3 | *хваліць* | *стаіць* | *бачыць* | *маўчыць* |
| мн. | 1 | *хвалім* | *стаім* | *бачым* | *маўчым* |
| мн. | 2 | *хваліце* | *стаіце(-ё)* | *бачыце* | *маўчыце(-ё)* |
| мн. | 3 | *хваляць* | *стаяць* | *бачаць* | *маўчаць* |

**Асабовыя канчаткі дзеясловаў першага спражэння**

| **лік асоба** | **на мякк., націск на аснове** | **на мякк., націск на канч.** | **на цвёрд., націск на аснове** | **на цвёрд., націск на канч.** | **на г, к, націск на асн.** | **на г, к, націск на кан.** | **зацв., націск на асн.** | **зацв., націск на кан.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| адз 1 | *чытаю* | *лью* | *устану* | *грабу* | *лягу* | *стрыгу* | *кажу* | *бяру* |
| 2 | *чытаеш* | *льеш* | *устанеш* | *грабеш* | *ляжаш* | *стры-жэш* | *кажаш* | *бярэш* |
| 3 | *чытае* | *лье* | *устане* | *грабе* | *ляжа* | *стры-жэ* | *кажа* | *бярэ* |
| мн 1 | *чытаем* | *льём* | *устанем* | *грабём* | *ляжам* | *стры-жом* | *кажам* | *бяром* |
| 2 | *чытаеце* | *льяце(-ё)* | *устанеце* | *грабяце (-ё)* | *ляжаце* | *стры-жаце (-ё)* | *кажаце* | *бераце (-ё)* |
| 3 | *чытаюць* | *льюць* | *устануць* | *грабуць* | *лягуць* | *стры-гуць* | *кажуць* | *бяруць* |

# КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ:
# РЫХТУЕМСЯ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА МОВЕ

***МАРФАЛОГІЯ: ДЗЕЯСЛОЎ І ЯГО ФОРМЫ***

## ПРАВАПІС АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ

1. **Падумайце і адкажыце на пытанні:**
   - Што такое спражэнне?
   - Якое значэнне мае катэгорыя асобы?
   - Што абазначаюць асабовыя формы?
   - Якія тыпы спражэння адрозніваюцца ў беларускай мове?
   - Якія асабовыя канчаткі маюць дзеясловы першага спражэння?
   - Якія асабовыя канчаткі маюць дзеясловы другога спражэння?

2. **Выканайце заданні:**
   - У дужках пастаўце лічбу, адпаведную спражэнню дзеясловаў: 1 – пры дзеясловах першага спражэння, 2 – пры дзеясловах другога спражэння.

*Калыхаць ( ), клеіць ( ), прынесці ( ), жаць ( ), развіднець ( ), бяліць ( ), малаціць ( ), раскалоць ( ), счышчаць ( ), счысціць ( ), вечарэць ( ), ус- таваць ( ), устаць ( ), знаходзіць ( ), знайсці ( ), нядужыцца ( ), глы- таць ( ), праглынуць ( ), верыцца ( ), цярпець ( ), вадзіць ( ), весці ( ), хадзіць ( ), жаніцца ( ), смяяцца ( ), світаць ( ), узбройвацца ( ), узбро- іць ( ), насмяшыць ( ), саромецца ( ), каваць ( ), непакоіцца ( ), выгля-
даць ( ), спаць ( ), вячэраць ( ), класціся ( ).*

   - Праспрагайце дзеясловы *біць, стаяць, уставаць, устаць, браць, узяць, выбраць, класціся, слаць (лён), слаць (ліст), смяяцца, сшыць, зжаць, аддаць, выпіць.*

   - Замяніце інфінітывы, што стаяць у дужках, неабходнымі асабовымі формамі.

*1. А якой гадзіне вы (уставаць)? 2. Куды гэта вы (ісці) так рана? 3. Можа, вы самі (пазваніць) мне? 4. А якой гадзіне вы (класціся) спаць? 5. Каму вы (несці) кветкі? 6. Што вы (узяць) з сабой у паход? 7. Што гэта вы так смачна (жаваць)? 8. Вам купіць любыя алоўкі ці (выбраць) самі? 9. Чаго вы (саромецца)? 10. Вы (адвесці) Андрэя да доктара? 11. Ці (даць) вы мне якую параду? 12. Гусі, гусі, калі вы ўжо да нас (прыляцець)? 13. Навошта вы (аддаваць) свае канспекты? 14. Вы (піць) многа кавы. 15. Ці многа вы (есці) садавіны?*

# ПРАВЕРАЧНЫ ТЭСТАВЫ МАТЭРЫЯЛ

## ПРАВАПІС <u>АСАБОВЫХ КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ</u>

**А1. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак – *ём,-ом.***

1) абцерці; 2) адабрыць; 3) адолець; 4) адрачыся; 5) адсячы; 6) адысці;
7) апрануць; 8) апячы; 9) асмяяць; 10) асячы; 11) дабрысці; 12) завалачы;
13) заглянуць; 14) зазваць; 15) звесці; 16) лямантаваць; 17) біць; 18) падперці;
19) прыйсці; 20) прынесці; 21) браць; 22) разаслаць (пісьмы); 23) раздражніць; 24) спадзявацца; 25) сцерагчы; 26) уздыхнуць; 27) узяць; 28) уліць; 29) ускласці; 30) ісці.

**А2. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага часу ўжываюцца з канчаткамі *–еш,-эш.***

1) абаперціся; 2) абламаць; 3) абсмяяць; 4) абцерці; 5) агледзець; 6) ад'ехацца;
7) адказаць; 8) адлічыць; 9) адолець; 10) адрачыся; 11) браць; 12) разаслаць (пісьмы); 13) раздражніць; 14) спадзявацца; 15) сцерагчы; 16) уздыхнуць;
17) узяць; 18) уліць; 19) ускласці; 20) ісці; 21) знемагчыся; 22) лячыць;
23) плакаць; 24) пляскаць; 25) сагнаць; 26) крышыць; 27) сыграць; 28) увайсці;
29) узгадніць; 30) забраць.

**А3. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга і будучага часу маюць канчатак *–іце,-ыце.***

1) абвешаць; 2) абяздолець; 3) абяздоліць; 4) адабраць; 5) ад'ехацца; 6) адламіць
7) адпусціць; 8) адчапіць; 9) адрэзаць; 10) апладзіраваць; 11) асэнсоўваць;
12) балбатаць; 13) вадзіць; 14) весці; 15) вісець; 16) выбегчы; 17) выехаць;
18) дагадзіць; 19) даламаць; 20) есці; 21) загасіцца; 22) заглянуць; 23) злазіць;
24) зычыць; 25) казаць; 26) купіць; 27) ляжаць; 28) ляскатаць; 29) лячыць;
30) наламаць; 31) паведаміць; 32) палепшаць; 33) палепшыць; 34) пільнаваць;
35) пісаць; 36) пішчаць; 37) прабегчыся; 38) прайсці; 39) разразаць; 40) раіцца.

**А4. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–іць,-ыць.***

1) адвучыць; 2) адкалоць; 3) адказаць; 4) адцерці; 5) акрэсліць; 6) апаласкаць;
7) вылепіць; 8) драмаць; 9) ездзіць; 10) зрубіць (хату); 11) паказаць; 12) плесці;
13) плакаць; 14) працякаць; 15) адсячы; 16) аб'яўляць; 17) адламаць; 18) адолець
19) адплаціць; 20) адпусціць; 21) адрэзаць; 22) адскочыць; 23) адысці; 24) апра
нуць; 25) ашчасліціць; 26) бачыць; 27) выбіць; 28) выйсці; 29) грашыць; 30) дай
сці; 31) загубіць; 32) казаць; 33) купіць; 34) клекатаць; 35) дзьмуць.

**А5. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-й асобы множнага ліку будучага часу маюць канчатак *–яце.***

1) абвесці; 2) абысці; 3) адысці; 4) апець; 5) асмяяць; 6) асэнсоўваць; 7) адабраць
8) атрэсці; 9) дажаць; 10) завесці; 11) замесці; 12) зламаць; 13) злазіць; 14) зра
біць; 15) выліць; 16) залямантаваць; 17) зляпіць; 18) накрыць; 19) напасці;
20) абуджаць; 21) павучыцца; 22) падгрэбці; 23) перакласці; 24) прйсці;
25) заспяваць; 26) паведаміць; 27) паплыць; 28) прабіцца; 29) састарэць;
30) разносіць.

**А6. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага часу маюць канчатак *–ем.***

1) абвесці; 2) абзавесціся; 3) абысці; 4) адазвацца; 5) адпомсціць; 6) адштурх
нуць; 7) веяць; 8) горшаць; 9) дагледзець (дзіця); 10) ездзіць; 11) ехаць; 12) загад
ваць; 13) зайздросціць; 14) засмяяць; 15) збэсціць; 16) іrваць; 17) напіцца; 18) на
сміхацца; 19) недаядаць; 20) пад'ехаць; 21) падклеіць; 22) прыгледзецца; 23) раз
біць; 24) радавацца; 25) разбураць; 26) развівацца; 27) разгледзець; 28) разгля
даць; 29) раззлавацца; 30) разлінеіць.

# СІНТАКСІС
# І
# ПУНКТУАЦЫЯ

# <u>РЭПЕЦІТАР</u>
# <u>СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ</u>
## <u>ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ ПРЫ АДНАРОДНЫХ ЧЛЕНАХ СКАЗА</u>

- ***<u>Аднароднымі</u>*** называюцца члены сказа – як галоўныя, так і даданыя, - якія выконваюць адну і тую ж функцыю ў сказе і адносяцца да аднаго і таго ж слова.
- Пры аднародных членах сказа, звязаных бяззлучнікавай сувяззю, выкарыстоўваецца коска і працяжнік.
  1. ***<u>КОСКА</u>*** – найбольш пашыраны знак прыпынку: ***Усміхнулася*** *сонца,* ***дыхнула*** *цяплом, міла праменне* ***рассеяла****.*
  2. ***<u>ПРАЦЯЖНІК</u>*** ужываецца ў некаторых выпадках для выражэння супрацьпастаўлення: *Не* ***кавыль – пшаніца*** *ззяе ў пацерках расы.*
- Пры аднародных членах сказа, звязаных злучнікавай сувяззю коска ставіцца і не ставіцца.

***<u>КОСКА СТАВІЦЦА</u>***

1. Калі АЧС звязаны пры дапамозе адзіночных супраціўных злучнікаў **а, але, ды (=але), аднак, затое: / О, а О /; / О, але О /** *Дзень* ***быў хмурны****, але* ***даволі*** *яшчэ* ***цёплы****.*
2. Калі АЧС звязаны пры дапамозе спалучальных або размеркавальных злучнікаў, якія паўтараюцца два разы ці больш (**і – і, ці – ці, або – або, то – то** і інш.): **/ ні О, ні О /; / ці О, ці О /** *Неба на гарызонце зрабілася не то* ***сінім****, не то* ***зусім белым****.*
   Усе АЧС аддзяляюцца адзін ад другога коскай, калі злучнік **і** паўтараецца і звязвае не ўсе, а толькі частку АЧ: **/ О, і О, і О /; / О, О, і О, і О /**
   *Пажаўцелі* ***травы, і лясы,*** *і* ***стэпы****. Абоз* ***імчыцца*** *па завулку,* ***грыміць і трубіць і звініць.*** **ПАРАЎНАЙЦЕ:** *Пажаўцелі і* ***травы, і лясы, і стэпы****.*
3. Паміж парамі АЧ, звязанымі спалучальным злучнікам **і: / О і О, О і О /**
   *Нас пакараюць* ***моры і рэкі, горы і нетры*** *зямлі.*
4. Паміж АЧ перад другой часткай парных злучнікаў: **/ як О, так О /; /хоць і О , але О / і інш.** *Буслы вясной* ***хоць і нясмела, але вельмі важна*** *шпацыруюць па балоце і лузе, выглядаючы сабе дабычу.*
5. Перад адзіночнымі злучнікамі **і, ды, ды і,** калі яны маюць далучальнае значэнне **<u>“і пры гэтым”</u>** ***Сады, палеткі, агароды, ды і лясы*** *густыя даюць працоўнаму народу свае плады з красой яскравай. Сабраўся ўзяць* ***трактар****, ды заадна і* ***малатарню.***

**КОСКА НЕ СТАВІЦЦА**

1. Паміж АЧ, звязанымі пры дапамозе адзіночных спалучальных або раздзяляльных злучнікаў **і, ды (= і ), ці, або, і інш.: / О і О /; / О ці О /**
   *Адам Міцкевіч* ***ведаў*** *і глыбока* ***адчуваў*** *стыхію народнай творчасці.*
   *Антось* ***зварочвае*** *направа* ***ды ідзе*** *на станцыю рухава.*
2. Перад злучнікам **і,** Які паўтараецца, але звязвае АЧ розных радоў: **/О і О О і О /**
   *Мянушкі ў нас давалі* ***малым і старым дужа проста і хутка****.*
3. Паміж АЧ, звязанымі неаднолькавымі злучнікамі: **/ О і О ці О /; / О і О або О /**
   *У кожнага партызана была* ***вінтоўка*** *або* ***аўтамат ці пісталет.***
   **<u>ЗАПОМНІ!</u>** Калі АЧ, звязаны не аднолькавымі спалучальнымі злучнікамі **і, ды (= і),** коска не ставіцца: **/ О ды О і О і О ды О /**
   *Усе* ***пахукваюць*** *ды* ***студзяць*** *і верашчаку тую* ***вудзяць*** *і толькі* ***чаўкаюць*** *губамі ды зрэдку* ***скрыгаюць*** *зубамі.*
4. Перад першым паўторным злучнікам, калі з яго пачынаецца пералічэнне
   *Неба то* ***патухала****, то* ***пачынала ярчэць****.*
5. Паміж АЧ, аб'яднанымі ў пары (але не паміж самімі парамі): **/ О і О, О і О /**
   *На лузе красаваліся* ***браткі і незабудкі, смолкі і званочкі****.*
6. Паміж неаднароднымі азначэннямі *А над бэзам раслі* ***высокія жоўтыя*** *вяргіні. <u>(жоўтыя вяргіні былі высокія)</u>*

# ПЛАНЫ-АЛГАРЫТМЫ
# ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВАГА ЗАДАННЯ
# СКАЗЫ З АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ

**Заданне 1. Адзначце нумары сказаў, у якіх трэба паставіць дзве коскі**.

1. Як у люстэрка, глядзіцца ў прыроду чалавек і бярэ ад яе душэўнасць _ і ласку _ і мудрасць.
2. У вёсцы я цудоўна адпачыў _ і пазнаёміўся з многімі цікавымі людзьмі _ ды нахадзіўся ўдосталь па лесе і сенажацях.
3. Ганна прывыкла таіцца, хаваць у душы і боль _ і тугу _ і надзеі.
4. Дрэва _ хоць і камянее ў сырой зямлі _ ды ўсё роўна гніе па-маленьку.
5. Светлым і чыстым _ аднак няўтульным _ выглядаў пакой.

**ХОД РАЗВАЖАННЯ**

Пры разглядзе дадзеных сказаў адразу адзначым, што ў 1, 2, 3-м сказах аднародныя члены сказа спалучаюцца пры дапамозе спалучальных злучнікаў, а ў 4, 5-м сказах пры дапамозе супраціўных. У 4-м сказе парны злучнік **хоць і ды,** коска ў такіх выпадках ставіцца перад другой часткай злучніка. У 5-м сказе злучнік **аднак**, а слова няўтульным з'яўляецца залежным ад выказніка **выглядаў,** значыць, мы не можам пасля яго паставіць коску. Разгледзім 1, 2 і 3-ці сказы: у 1-м сказе аднародныя члены сказа **душэўнасць, і ласка, і мудрасць,** можна замяніць канструкцыяй **і душэўнасць, і ласка, і мудрасць,** значыць неабходна паставіць дзве коскі. У трэцім сказе аднародныя члены сказа **і боль, і тугу, і надзеі,** спалучальны злучнік **і** паўтараецца тры разы, значыць неабходна паставіць дзве коскі. У 2-м сказе аднародныя члены сказа **адпачыў і пазнаёміўся ды нахадзіўся,** мы бачым розныя спалучальныя злучнікі, значыць коска не ставіцца.

**АДКАЗ: 1, 3**

## ВЫКАНАЙ ТЭСТАВАЕ ЗАДАННЕ САМАСТОЙНА

***1.* Адзначце нумары сказаў, у якіх трэба паставіць дзве коскі:**

1. Стары Даніла замяніў яму _і дзеда _ і бацьку _ і маці.
2. Жывёліна гэта _ хоць і рэдкая ў нас _ але даволі шкодная.
3. У гэтай вадзяной зарасці хавалася рыба _ або адпачывала пасля жыравання _ або проста ратавалася ад сваіх заклятых ворагаў: шчупакоў ці акунёў.
4. Велізарныя крыгі лёду напаўзалі адна на адну _ і са страшэнным гулам крышыліся на меншыя _ і разбіваліся на друзачкі.
5. Раса была на доўгім кавылі _ і на пушыстым мятліку _ і на пунсовых кубачках макаў.

***2.* Адзначце нумары сказаў з двума радамі аднародных членаў:**

1. Павуціна вісела ў паветры, абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік, пажоўклыя кусты.
2. Кнігі Коласа нам і калыскай. І школай былі.
3. Адзенне знаці шылася з дарагіх тканін ды ўпрыгожвалася вышыўкай, залатымі ніцямі і каштоўнымі камянямі.
4. Перш за ўсё трэба ведаць свой народ, цаніць яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць.
5. Я змераў Мінск і ўпоперак, і ўдоўжкі, спазнаў усе завулкі, тупікі.

**КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ: РЫХТУЕМСЯ ДА ЭКЗАМЕНА**
**СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ**
**ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКАЗАХ З АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ**

**1. Адзначце сказы, у якіх ставіцца коска на месцы кожнага пропуску.**

1. Неба несціхана слязілася _ ці то драбнюткім дожджыкам _ ці то буйной вільгаццю.
2. У спакойнай вадзе адлюстроўваецца белае неба з нерухомымі воблачкамі – і стагі сена на паплавах _ і зялёны нізкі бераг.
3. Моцныя парывы ветру зрывавлі лісце з кустоў – то ярасна падкідваючы высока ўгору _ то гонячы між ствалоў па мокрай зямлі.
4. У спеве жупана можна пачуць _ і стракатанне сарокі _ і цвырканне вераб'я – і шчабятанне ластаўкі – і меладычны спеў івалгі – і хрыплае карканне вароны.
5. У хоры былі пяшчотныя тэнары _ і аксамітныя барытоны – і разложыстыя, нібы ліпеньскі гром, басы.
6. Кашуля мела круглы _ або чатырохвугольны _ ці косы выраз.
7. Дарога рабіла шмат паваротак _ або бегучы між узгоркаў і сядзіб _ або перасякаючы лясы і балоты.
8. Завішнюк здымае акуляры _ ды ўсё трэ _ ды трэ іх.
9. Барвовасць _ ды блакіт _ ды бель садоў расквецілі, нібы вясёлкай, далі.
10. Мова дае каларыт твору, робіць яго баявым _ або спакойным, паэтычным _ або нудным, лірычным _ або суровым.
11. У прыёмную даносіўся _ то грозны, павучальны барытон дырэктара _ то скрыпучы тэнарок Зоські.
12. Злева ад нас святлела шырокая гладзь Дзвіны _ то хаваючыся за абрывамі _ то выступаючы зноў кавалкамі абернутага на зямлю зорнага неба.
13. І не хопіць рук, і не хопіць вачэй, каб абняць усю родную далячынь _ і гэты стракаты ніў узор _ і небасхілаў дымную даль.
14. Гэта дружба _ і суровая, па-мужчынску стрыманая _ і цёплая, чулая адначасна.
15. Шумелі _ і дзынькалі пчолы ў густым вецці прысад _ і ў пышных кветніках.
16. А настольнік – пласт імшысты _ ды прыгожы _ ды іскрысты.
17. У асінніку _ не то крычыць _ не то плача каня.
18. У студзень _ ці ліпень, у дождж _ ці марозы за ціхаю рэчкай бялеюць бярозы.
19. Ноч _ хоць і асенняя _ але светлая ад зор.
20. Пасля трывог прыемна было выкупацца ў моры _ ды паляжаць на цёплай гальцы _ і пазагараць.
21. Усурыйскія яноты з белавежскай пушчы выстаўлены ў Гродзенскім заалагічным садзе ў якасці прадстаўнікоў _ не толькі далёкаўсходняй _ але і мясцовай фауны.
22. Сваты звычайна выдавалі сябе за падарожнікаў _ або купцоў _ або паляўнічых.
23. Зямля-карміцелька любому _ і сілу дасць _ і боль загоіць.
24. Раса была на доўгім кавылі _ і на пушыстым мятліку _ і на пунсовых кубачках макаў.
25. Стрэхі крыты шыферам _ ці гонтаю _ ці чарапіцай.

**2. Адзначце сказы, у якіх азначэнні з'яўляюцца аднароднымі і раздзяляюцца коскай.**

1. Сярод лясоў і вялізных – неабсяжных балот на пясчанай выспе раскінулася вёска.
2. Навокал разляглося неабсяжнае _ каламутнае неба.
3. Таленавітая _ энергічная _ здаровая моладзь ідзе нам на змену.
4. Лясной малінай палымнее грымлівае _ маланкавае лета.
5. Жонка засцяліла падсінелай _ пругкай ад крухмалу прасцiной ложак сыну.
6. Лежачы, Алесь глядзеў у высачэзную просінь, на ляную плынь недасяжных _ пяшчотных аблокаў.
7. Са свайго падарожжа я вынес уражанне, што лес заселены добрымі _ спагадлівымі звярамі і птушкамі.
8. У невялікім _ голым _ бярозавым гайку зрабілі прывал.

9. На спакойнай сіні нябёсаў загарэліся першыя _ трапяткія зоркі.
10. Горад зіхацеў сінімі _ белымі _ жоўтымі агнямі.
11. Ля палатак свяціўся прываблівы _ гасцінны агонь.
12. Прыемнае _ салодкае пачуццё поўніла машына сэрца.
13. Усё далей ад хлопцаў цвёрды _ надзейны і такі жаданы бераг.
14. Андрэй паглядзеў з-пад нахмураных _ ледзь прыкметных _ залацістых брывей, але не адказаў.
15. Міхась спыніўся каля прыгожа афарбаванага _ высокага будынка.
16. У гладышы пагнулі галовы прывялыя _ чырвоныя вяргіні.
17. Глухая _ горкая бяда раптоўна звалілася на плечы старога.
18. Пайшоў халодны _ з пранізлівымі парывамі ветру дождж.
19. Я пацiснуў цяжкую шырокую далонь абсiвералай вятрамі _ запыленай рукі.
20. Хацелася заглянуць за дзіўны _ борам акаймаваны далягляд.
21. Марудна цягнуўся панылы _ змрочны дзень.
22. З прыўзнятым _ бадзёрым настроем крочу далей.
23. Набрынялыя _ цёмныя хмары зацягнулі неба.
24. Праз лес вяла не зарослая травою _ нешырокая рачулка.
25. Празрыстае _ ранішняе марыва плыло над зямлёй.

**3. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца працяжнік.**

1. Лугі, выганы, старыцы, сухія летам азярынкі _ усё залівала вадой.
2. Варылі-гатавалі паводле старых правіл, у меру дадавалі шматлікія прыправы – і часначку з цыбулькай, і перчыку з пятрушкай.
3. Сонца, вецер, лясы, прасторы _ уся прыгажосць зямлі з яе раніцамі і вечарамі, росамі і дажджамі скрозь на тваім вяку.
4. Смех, вясёлыя галасы, шорганне ног, музыка, лёгкае шапаценне кранутага вячэрнім ветрам лісця ліп і каштанаў _ усе гукі зліваліся ў невыразную, але жыццярадасную сімфонію.
5. Сонечная цяплынь, аксамітная зеляніна палёў і лясоў, чыстае паветра, звон радасных песень жаваранкаў _ абуджалі цудоўны настрой.
6. Некаторыя з лугінаўцаў займаліся промысламі: рабілі цэбры, кадушкі, колы, выраблялі рагожы _ ды вазілі сваю “прадукцыю” за дваццаць вёрст у горад на продаж.
7. У прыбярэжных кустах, у парку, у зарасніках лазняку _ шчабятала птаства.
8. Зямля, дрэвы, стрэхі _ пакрыліся звонкай ледзяной коркай.
9. У холад і ў спёку, у дождж і пасля дажджу, маладзіком і ў поўню – ён заўсёды прыгожы, наш родны, наш любы край.
10. Здаецца, усё вакол: кветкі, промні, птушыныя песні _ яднаюцца ў непаўторную мелодыю жыцця, якая запаўняе сабой палі, лугі, лясы.
11. Спаленыя вёскі, ямы ад снарадаў і бомбаў, пакапаныя пад акопы палі _ сведчылі пра недалёкае мінулае жахаў і чалавечых пакут.
12. З дубу гнулі абады, палазы, рабілі бочачкі, кадушкі, дзежкі _ адным словам, усё, што павінна доўга служыць чалавеку.
13. Краскі, краскі, цэлае мора розных красак _ белых, жоўтых, чырвоных, блакітных.
14. Шырокі адкрыты твар, моцны поціск важкай пляскатай далоні _ усё гэта гаварыла аб тым, што характару гэтага чалавека не ўласцівы мітуслівасць, таропкасць.
15. Снег павісаў на галінах дрэў, на кустах лазняку _ клаўся на бярвенне, упрыгожваў пні белымі шапкамі.

**4. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі.**

1. Наступнай раніцаю дрэвы, кусты, бруснічнік _ усё ўкрывала алмазная калматая шэрань.
2. Барвай набрынялі пеністыя лёгкія хмаркі, чырвань заліла ўсё: і лес, і вёску, і паплавы.
3. Над балотцам за палеткамі, то кружылі, то чарадою адплывалі гусі.
4. А на базары чаго толькі няма: рэшаты, гармонікі, агуркі, вяроўкі, соль, драчонікі з алеем, усяго не пералічыш.

5. Наш камбат – тыповы вайсковец, узорны ва ўсіх адносінах афіцэр, падцягнуты, лаканічны ў словах, у меру суровы і мяккі, заўсёды справядлівы.
6. У лесе і на палях, у гарадскіх скверах і на вуліцах, у сухой траве і нават у паветры, словам, паўсюль адчувалася набліжэнне восені.
7. Зімою балота сумна шастала сухім чаротам, асакою, бялела снегам; вясною тлуста чарнела дрыгвяністаю багнай, зелянела рослай аксамітнай травою.
8. А хмары чорныя то ласкай бліскаюць, то сілай хваляцца.
9. Тут падавалі: бульбяны, грыбны, фасолевы супы, грэчневую, пярловую, рысавую кашы.
10. Навокал цішыня. Усё нібы анямела, або вымерла.
11. Знадворку ўсё: аканіцы, дзверы, дзверы і канёк – аздоблена кужалем грубаватай драўлянай разьбы.
12. Ні слупа, ні стога, ніхаты, нічога не відаць.
13. Для мяне дарагою самаю ракою быў і застанецца мой летуценны і казачны, мой ціхі і велічны, мой добры і ласкавы Сож.
14. Вецер, хоць і нямоцны, але халодны.
15. Гэты луг і рэчка, і вольхі над ёй – адным словам, усё выглядала як бы адноўленым.

# РЭПЕЦІТАР
# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ
# СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ

Складаны сказ, у якім сінтаксічна раўнапраўныя часткі звязаны паміж сабой з дапамогай злучальных злучнікаў, называецца **складаназлучаным.** Сродкамі выражэння граматычных значэнняў складаназлучаных сказаў з'яўляюцца злучнікі. Яны размяшчаюцца паміж састаўнымі часткамі сказа і не ўваходзяць ні ў адну з гэтых частак.

Для сувязі частак у складаназлучаных сказах ужываюцца **спалучальныя, супастаўляльныя і пералічальна-размеркавальныя злучнікі**, якія адначасова служаць і сродкам выражэння разнастайных адносін паміж часткамі: **спалучальных, супастаўляльных, пералічальна-размеркавальных, прычынна-выніковых і далучальных.**

**Спалучальныя адносіны** выражаюцца злучнікамі ***і, ды (= і).*** У гэтых сказах гаворыцца аб дзеяннях ці з'явах, якія адбываюцца **адначасова або паслядоўна**, адно за адным: *Ціха шэпчуцца чароты, і калышацца аер. Прайшло лета, і настала восень.* Злучнік ***і*** можа звязваць часткі складаназлучанага сказа з **прычынна-выніковымі адносінамі** (у першай частцы заключаецца прычына, у другой – вынік): *Спадзе вада, і травы забуяюць.*

**Супастаўляльныя адносіны** выражаюцца пры дапамозе злучнікаў ***а, але, ды (=але), аднак, затое***. Сярод гэтых сказаў выдзяляюцца дзве разнавіднасці: а) сказы, у якіх дзеянні, з’явы, прыметы супастаўляюцца – паказваецца іх адрозненне: *Мінула восень, а за ёю прыйшла з марозамі зіма.*;б) сказы, у якіх выражаецца супрацьпастаўленне – змест другой часткі не адпавядае таму, што павінна было б вынікаць са зместу першай часткі: *Мякка сцеле, ды цвёрда спаць.* Адносіны супастаўлення з дадатковым выдзяляльным адценнем часам могуць выражацца пры дапамозе злучнікаў ***толькі, ж (жа), аж***: *Я хлеба ў багатых прасіў і маліў, яны ж мне каменні давалі.*

**Пералічальна-размеркавальныя адносіны** выражаюцца пры дапамозе злучнікаў ***або, ці, то – то, ці то – ці то, не то – не то, ні – ні.***

Злучнікі ***то – то, ці – ці*** паказваюць на паслядоўную змену падзей, іх чаргаванне ці пералічэнне: *Ці жаўрук звінеў у небе, ці свістаў на ліпе шпак.*

Злучнікі ***або, або – або, ці, ці то – ці то, не то – не то*** аб’ядноўваюць часткі складаназлучаных сказаў, у якіх гаворыцца пра падзеі і з’явы, што ўзаемна выключаюць адна другую. У гэтых сказах, як правіла, выражаецца няўпэўненасць, меркаванне, сумненне: *Або свет пачуе, або душа трэсне.*

**Далучальныя адносіны** выражаюцца пры дапамозе злучнікаў ***і, ды (=і), а, але, а то.*** У такіх сказах другая частка дапаўняе змест першай дадатковым паведамленнем, тлумачэннем, якой-небудзь заўвагай: *Ён будзе змагацца, і змаганне гэта будзе цяжкім.*

## <u>Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе</u>

1. Часткі складаназлучанага сказа найчасцей аддзяляюцца адна ад другой **коскай**, незалежна ад разнавіднасці злучальных злучнікаў
- У сказах са спалучальнымі злучнікамі ***і, ды (=і):*** *Насустрач хмары паплылі, і стала ўраз цямней.; Прыпякала сонца, ды веяў лёгкі ветрык.*
- У сказах з супастаўляльнымі злучнікамі ***а, але, ды (=але), аднак, затое***: *Трымае маці ладны клунак, а сын тры кніжкі ў руцэ.*; *У жнівеньскі дзень зранку вуліца дрэмле, затое поле поўніцца жыццём.*
- У сказах з пералічальна-размеркавальнымі злучнікамі ***ці, або, ці – ці, або – або, ці то – ці то, не то – не то:*** *То іней асыпаецца на скронь, то хвошча лес ігліцаю і снегам.*; *Ці то сонца свеціць, ці то месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна.*

2. **Коска не ставіцца** перад злучнікамі ***і, ды (=і), ці, або***
- Калі часткі, злучаныя гэтымі злучнікамі маюць агульны даданы член сказа, часціцу ці пабочнае слова: ***Пад вечар*** *неба завалакло хмарамі і ўзняўся вецер.*; ***Відаць****, тут быў нядаўна рамонт і яшчэ не паспелі зрабіць парадку.*; ***Хай*** *шчасце куецца на свеце і вечная дружба расце.*
- Калі спалучальныя часткі маюць форму пытальных, пабуджальных або клічных сказаў і цесна звязаны па сэнсу: *Куды ж ісці і што рабіць?; Ідзіце ў хату ды сядайце за стол.*
- Калі часткі маюць форму аднасастаўных неразвітых сказаў: *Холадна і змрочна.; Шуміць у галаве і хочацца спаць.*

3. Калі часткі складаназлучанага сказа даволі развітыя або ўскладненыя і маюць свае знакі прыпынку, то перад злучнікамі ***і, ды, а, аднак, затое*** ставіцца **кропка з коскай**: *У лесе, недалёка ад вёскі, было змрочна і ціха; затое ў вёсцы, ярка асветленай электрычнымі агнямі, чуліся песні, музыка.*
4. Калі другая частка складаназлучанага сказа паказвае вынік, хуткую змену падзей або рэзкае супастаўленне, тады паміж часткамі ставіцца **працяжнік**: *Узмах вясла – і сонны бераг адразу пачынае жыць.; А з'ясі ты з бульбай скварку – і работа пойдзе шпарка.; Бацька на работу – а Міхась на вуліцу.*

### Выканайце заданне самастойна:

**Выпішыце з тэксту ўсе складаназлучаныя сказы, падкрэсліце граматычную аснову кожнай іх часткі.**

*Шафёр зняў хуткасць, і машына павольна пакацілася да слупа са знакам прыпынку. А калі ўжо вось-вось павінна была стаць, пасажыры ўбачылі: да аўтобуса бегла дзяўчына. Аўтобус мякка спыніўся. Дзяўчына падбегла да шафёрскай кабіны, працягнула шафёру абедзве рукі з двума рамонкавымі букетамі. Шафёр, прыгожы юнак, узяў разам з букетам левую дзяўчыніну руку, прытрымаў яе ў сваёй, ды праз якую секунду дзяўчына пырхнула, як птушка, і пабегла. Хлопец, гледзячы ўслед, даў лёгкі газ, машина пакацілася. Пасажыры не зводзілі вачэй з дзяўчыны, а яна з рамонкавым у правай руцэ букетам адлятала ад дарогі, ніразу не азірнуўшыся.*

**ПЛАНЫ-АЛГАРЫТМЫ**
**ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ**
**СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ**
**СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ**

**ЗАДАННЕ 1.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска.
1) *Летам было шмат цяпла _ і зямлю паілі спорныя дажджы.*
2) *На стале стаяла лямпа _ і ляжала некалькі новых кніг.*
3) *У гурбах снегу ліпа з холаду дрыжыць _ і чакае цёплых веснавых дзён.*
4) *Край неба амаль зліваецца з гарызонтам _ і мора здаецца бясконцым.*

**ХОД РАЗВАЖАННЯ.** Умова задання арыентуе на тое, што неабходна адрозніць складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх ставіцца коска, як у першым і чацвёртым сказах ( у сказе дзве граматычныя асновы, якія злучаны злучальным злучнікам ***і***), ад простых сказаў з аднароднымі выказнікамі (трэці сказ). Самая складаная сітуацыя ў другім кантэксце: сказ складаны, бо мае дзве граматычныя асновы – *лямпа стаяла, некалькі кніг ляжала,* аднак абедзве яны маюць агульную акалічнасць месца *на стале*, таму коска паміж часткамі такога складаназлучанага сказа не ставіцца.

**АДКАЗ: 1, 4**

**ЗАДАННЕ 2.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска.
1) *Кідаюць зоры срэбра ў крыніцы _ а я лаўлю яго сваёй рукой.*
2) *Гады прайшлі _ ды я ўсё помню твой першы крок насустрач мне.*
3) *У небе зоры міргаюць, гараць _ і ззяе яскравага месяца круг.*
4) *Колькі птахаў пявучых у родных лясах _ і колькі нот непаўторных у іх галасах!*
5) *Яшчэ пару рыўкоў _ і сініца ў руцэ.*
6) *Лёгкае пяро – ды на страху не закінеш.*
7) *У цішыні часта і звонка падалі кроплі бярозавіку ў бляшаны бачок _ ды ледзь чутна шапацела голле.*
8) *Гаворыць і ветрык ласкавы _ і птушкі гавораць, і травы.*
9) *Як далёка заляцела наша родная песня _ і як прыйшлася яна многім даспадобы!*
10) *Ёй толькі слова сказаць _ і ў сэрцы юначым успыхне агонь.*

# КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ
# ТЭМАТЫЧНЫЯ МІКРАСХЕМЫ
# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ
## Памылкі пры аналізе складаназлучаных сказаў і пастаноўцы знакаў прыпынку ў іх

Памылкі пры пастаноўцы знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах у асноўным звязаны з няведаннем тых момантаў, калі коска не ставіцца.

Важна ведаць, што коска паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія звязаны злучнікамі ***і, ды(=і)***, **не ставіцца** ў наступных выпадках:

- калі часткі маюць форму **назыўных** сказаў (асабліва неразвітых або маларазвітых): *Бяскрайняе поле і мора санечніку. Бяроза і непатаптаная трава.;*
- калі часткі маюць форму **безасабовых** сказаў**:** *Вечарэе і пахне акацыяй. У акне засінелася і хутка развіднела.;*
- калі часткі маюць **пытальную** або **клічную** інтанацыю: *Колькі клопату і колькі дабрыні! Куды ж ісці і што рабіць?;*
- калі часткі супастаўляюцца і маюць **аднатыпную** будову: *Цвіце яблыня і асыпаецца вішня. Доўгачаканая вясна прыйшла і сонная рэчка заспявала.,* **АЛЕ:** *Ты раскажаш, а я паслухаю. Ты спытаеш, а я змаўчу.* – часткі звязаны **супраціўным** злучнікам;
- калі дзейнік другой часткі выражаны азначальным займеннікам ***сам (сама):****вадзіцель выйшаў з машыны і сам агледзеў дарогу.;*
- калі выказнік або звязка састаўнога выказніка ў другой частцы апушчаны: *Петрусёк пабег па вузкай лугавой сцежцы і Марынка следам за ім.;*
- калі спалучальныя часткі маюць агульныя для іх даданыя члены сказа, пабочнае слова, часціцу: *У шторм ён далёка не заплываў і яна не прыходзіла.;*

**УВАГА:** коска ставіцца перад злучнікамі ***і, ды,*** калі пры выказніках кожнай часткі ёсць аднолькавыя даданыя члены сказа: *Каля ракі, як і ўвечары, заліваліся ў нястрымным запале салаўі, ды над жытнёвым палеткам дрыготкімі крапінкамі віселі жаўранкі, славячы надыход новага дня.* Акалічнасці месца *каля ракі* і *над жытнёвым палеткам.*

Перад злучнікам ***і*** звычайна ставіцца **працяжнік**, калі другая частка складаназлучанага сказа паказвае на вынік, хуткую змену падзей: *Раздаўся зычны гук – і сухая галінка разляцелася на кавалачкі. Адзін, другі заварот – і перад ім адкрылася мора.*

**УВАГА:** заўсёды ставіцца **працяжнік**, калі першая частка мае форму назыўнога сказа і ёсць указанне на хуткую змену падзей: *Некалькі хвілін язды – і паказаліся між зялёнага алешніку высокія парыжэлыя стагі сена.*

## ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ ЗАМАЦАВАННЯ

1. **Аформіце сказы ў адпаведнасці з нормамі пунктуацыі. Патлумачце знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа.**

*1. Аціхае вечар, і аціхае горад. 2. Сінія званкі. Адзін корань, адна націна: і ўжо букет. 3. Раптам у лесе нешта шаснула: і на паляну выскачылі дзве казы. 4. Перад сябрамі, то распасціралася шырокае поле з парыжэлым іржэўнікам, то раптам зелянеў луг і маленькая рэчка пятляла на ім, як быццам выбіраючы лепшае месца. 5. Скрозь стаяла вада, і са стрэх капала. 6. Сталыя і важныя буслы з незвычайнаю сур'ёзнасцю хадзілі па краях балота, аболяталі да гнёздаў на старых хвоях, і папраўлялі свае апушчаныя на зіму палацы. 7. Так зрабіўся Міколка кулямётчыкам а дзед Астап – кавалерыстам. 8. У траве дзе-нідзе валяліся непадабраныя дробныя трэскі, і жаўцела, як высеўкі, пілаванне.*

2. **Знайдзіце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі. Запішыце сказы правільна.**

*1. У даліне холадна. Апускаецца густы туман альбо пачынае марасіць дождж. 2. Радасна свяціла сонца і было ціха-ціха. 3. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва, ды моклі панурыя лясы. 4. Пералесак скончыўся і вакол раскінуўся бязмежны, як здалося Арсеню, прастор. 5. Здавалася, сонца заходзіць, і холадам цягне з шырокай Дзвіны. 6. То дождж ык то сонца,то вецер, то згортвае хвалі ў баранчыкі. 7. Пілікае скрыпка, і цокаюць абцасікі. 8. Возера зноў зрабілася ціхім і спакойным а вада чыстай і празрыстай. 9. Лёгка дыхаць пасля дажджу, і лёгка ісці.*
*10. Паглядзіш – і галаву міжвольна адкідаеш назад.*

3. **Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска:**

1) *Гасне ціша _ і гаснуць сны.*
2) *Лес загарэў пад летнім сонцам _ і лісце на дрэвах стала жаўцець.*
3) *Адшмаргні галінку_ і парэжашся.*
4) *Пахне цёплым бярозавым сокам _ і свежай рошчынай.*
5) *Ягадам яшчэ б расці _ ды расці.*

4. **Адзначце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі:**

1) *Абапал вуліц растуць клёны, і ў цэнтры – парк.*
2) *Далёка цягнецца паўз лес балота, і расце тут лаза.*
3) *Холадна і маркотна.*
4) *Яшчэ імгненне, і распусціўся бутон.*
5) *То цёпла то холадна, то свеціць сонца, то пахмурна.*

## КАРЭКЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ: РЫХТУЕМСЯ ДА ЭКЗАМЕНА
## СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ
## СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ

**1. Адзначце сказы, дзе перад злучнікам *і* (на месцы пропуску) ставіцца працяжнік.**

*1) Мякка зашамацела мокрае лісце _ і зноў усё сціхла.*
*2) Дождж перастаў на світанні _ і хлопцы зараз жа пачалі рыхтавацца ў дарогу.*
*3) Глыток вады з палескай студні _ і кволы стане дужым, маладым.*
*4) Лес на другім беразе быў густа падсінены смугой _ і жоўты пясчаны абрыў наперадзе здаваўся размытым шэрым, густым паветрам.*
*5) Імгненне _ і зноў перада мною глыбокія, як бы выразаныя нажом, маршчыны ля пухлага носа старшыні.*
*6) Кароткі міг _ і вавёрка маланкай знікла ў вершаліне кашлатай хвоі.*
*7) Шафу мы крыху адсунулі ад сцяны _ і за ёю ўтварыўся невялікі закуточак.*
*8) Дарога была гразкая, уся ў калдобінах _ і матацыкл то рэзка падкідвала ўгору, то шпурляла ў бакі.*
*9) Хвіліна _ і плыт перавярнуўся.*
*10) Некалькі прысяданняў, рэзкіх узмахаў _ і цела напаўняецца сілай.*
*11) Але вось зашамацелі кусты _ і на паляну выскачыў сабака.*
*12) Хвалямі набягаў вецер _ і тады густа сыпалася з дрэў лістота.*
*13) Закрыеш вочы _ і дзіўныя вобразы адзін за адным лунаюць у карагодзе бясконцым.*
*14) Яшчэ дзень-другі _ і хата гатова.*
*15) Тры гадзіны ходу _ і там.*
*16) Усё мацней прыгравала сонца _ і з гаю павявала на поле душнаватым водарам бярозавага лісця.*
*17) Званок _ і ўсё ў школе ажыло, загуло, як у раістым вуллі.*
*18) Некалькі хвілін язды _ і паказаліся між зялёнага алешніку высокія парыжэлыя стагі сена, пасля – ўроскідку новыя хаты.*
*19) Кінь непатушаную запалку _ і пабяжыць агонь не толькі па зямлі, але і па верхавінах дрэў.*
*20) Над манежам вісела вострая цішыня. Крыкні _ і ўсё сарвецца.*
*21) Аўтобус спыніўся _ і пярэднія дзверцы нячутна і мякка раз’ехаліся.*
*22) Карабель прычаліў да берага _ і ў ягоны борт лянiва біла стомленая хваля.*
*23) Трымаўся невялікі марозік _ і пад нагамі ледзь чутна парыпваў снег.*
*24) Яшчэ хвіліна _ і разарвецца хмара, разліецца шчодрым майскім дажджом.*
*25) Я шчаслівы. Усю вайну ў пяхоце _ і ніводнай драпіны.*

**2. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх перад злучнікам (на месцы пропуску) не ставіцца коска.**

*1) Вада ў лодцы ўсё прыбывала _ і ніякая сіла ўжо не магла зараз спыніць яе.*
*2) Худы мышасты конік падбадзёрыўся, весела фыркнуў _ і сам пабег, па сваёй ахвоце.*
*3) Няхай шумяць вятры _ і непагода вые.*
*4) Ужо і рукі ад цяжкага кошыка забалелі _ і ногі прытаміліся _ і адпачыць зноў захацелася. А знаёмай дарогі ўсё не было.*
*5) У канцы вёскі чуўся плач, жаночыя крыкі_ ды высока над старымі ліпамі ўзвіхрыліся клубы чорнага дыму.*

*6) Пад хмарамі дзікія ветры равуць _ і чуецца крык жураўліны.*
*7) Хутка туман пачаў рассейвацца _ і тады насустрач машынам выплывалі будынкі.*
*8) У аголеных кустах пашумліваў вецер _ і маркотна шуршэлі белыя струмені снегу ў парыжэлай траве.*
*9) За акном кружыцца ціхі снег _ і блукаюць злосныя вятры.*
*10) Над галавою неба сінява _ і неабсяжны далягляд бясконцы _ і сцелецца пад ногі нам трава.*
*11) Недзе ўнізе санліва варочаецца рака ў сваіх берагах _ ды размінаюць плаўнікі тлустыя самы.*
*12) Зайшоў дзед праз веснічкі на двор _ і сам зачыніў браму.*
*13) У хаце было душна _ і прыемна пахла здобным цестам.*
*14) З раніцы захмарылася _ і падзьмуў моцны вецер.*
*15) Яшчэ сняжком зямлю не замяло _ ды халадком дыхнулі ўжо абшары.*
*16) За канаўкаю чалавек прывязаў каня да плота _ і сам крута завярнуў за вугал.*
*17) За хатамі зелянелі ўтульныя садкі _ ды бялела густымі статкамі качанне капусты на агародах.*
*18) Чаму часам сэрца млее _ і не пазбыцца ліпкіх дум?*
*19) Калі-нікалі праляціць з піскам кажан _ або пракрычыць сава _ ці прашугаюць чарадою спалоханыя птушкі.*
*20) Пры пыльнай дарозе шумяць палыны _ і маркотныя плачуць наводдаль каліны.*
*21) Здаецца, бялейшыя сталі гнуткія бярозы _ і яшчэ вышэй падаліся стромкія хвойкі і елкі.*
*22) Здаецца, зусім нядаўна мы напісалі пісьмо _ і вось прыйшоў ужо адказ.*
*23) Здаецца, свет звузіўся вакол цябе _ і паветра насычана перадвандравальнічымі подыхамі.*
*24) Заснулі дрэвы ў пухавых аснежаных уборах _ і чыстым золатам на іх ліюцца ціха зоры.*
*25) Кудахталі заклапочаныя куры _ ды певень раз за разам дзёр горла на абымшэлым плоце.*
*26) І над усім гэтым вадзяным царствам, як рознакаляровыя шклінкі, мігцелі імклівыя стрэлкі _ ды стаяў густы, нібы настоены, камарыны звон.*
*27) Каб пілося і елася _ і болей не хацелася!*
*28) Ужо і яблыкі знялі _ і агароды запуставалі _ і лес распранаецца.*
*29) Марыя збірала са сталоў пакінуты ўчора посуд _ і сама насіла на кухню.*
*30) Адзінокія бярозкі жаўцелі між зелені сосен _ і былі яны самотныя, як сіроты.*
*31) З дня ў дзень губляла празрыстую блакітнасць неба _ і, ўсё часцей хмурнеючы, яно як бы ніжэй апускалася на зямлю.*
*32) Сучча на вогнішчы дагарэла _ і цяпер, то ўспыхваючы, то сцішваючыся, тлелі зыркія барвовыя агеньчыкі.*
*33) На палях яшчэ цямнелі сланечнікі _ і чырванелі нераспелыя памідоры.*
*34) Сын батрака, Кузьма Чорны з малых год наглядаў гаротнае жыццё вясковай беднаты _ і сам зазнаў усе нягоды гэтага жабрацкага жыцця.*
*35) Здараецца, да ніткі дождж прамочыць _ ці высеча няшчадна жорсткі град.*

# V ЭТАП ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ

# ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ
# ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ
## ТЭСТ № 1

1. **Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар ДЖ абазначае два гукі.**
   1. аджартавацца; 2. джала; 3. пасаджу; 4. паджаць; 5. агароджа
2. **Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі.**
   1. сівы, церушыць; 2. кулінарыя, ціхенька; 3. скураны, шпалеры; 4. гуляць, гульнявы;
   1. начыста, спіна
3. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара Э.**
   1. інт _рвал; 2. інтэрв _нцыя; 3. маян _з; 4. р _чны; 5. р _валюцыя
4. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара А.**
   1. танк _целы; 2. шкл _валакно; 3. выс _кагорны; 4. кур _дым; 5. д_браякасны
5. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара І.**
   1. звыш _нтэлектуальны; 2. суб _нтэндант; 3. пад _грываць;
   4. за _нтрыгоўваць; 5. пры _шла
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца прыстаўная літара.**
   1. _астрэйшы; 2. Ля _он; 3. _льха; 4. _птам; 5. _удзел
7. **Адзначце словы, у якіх пішацца Ў.**
   1. юныя _краінскія чытачы; 2. рака _шача; 3. паклікалі _ладзіка;
   4. ка _чук; 5. святочна- _рачысты
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.**
   1. любан _скі; 2. мел _хіёр; 3. нал _ю; 4. дз _ме; 5. ноч _
9. **Адзначце словы, у якіх прапушчана літара.**
   1. шас _наццаць; 2. фарпос _ны; 3. кос _ны мозг; 4. зас _лаць ложак; 5. ап _лікацыя
10. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф.**
    1. В _етнам; 2. павіл _ён; 3. пад _ёмнік; 4. мнагаслоў _е
11. **Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара.**
    1. (П,п)етрусёва дачка; 2. (Д,д)амоклаў меч; 3. (К,к)оласаўская творчая манера; 4.(М,м)іністэрства шляхоў зносін; 5. (К,к)упалаўскія чытанні
12. **Адзначце словы,у якіх ёсць падоўжаная зычная.**
    1. дзеся _цю; 2. гру _па; 3. заці _ша
13. **Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.**
    1. прыгарад; 2. паціху; 3. здымак; 4. забяліць; 5. прысвоіць
14. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў прамым значэнні.**
    1. *ніткі* пражы; 2. *сеяць* лён; 3. *цвёрда* стаяць на сваім;
    4. *гамоняць* бары; 5. ворага *касілі* кулі

15.**Адзначце сказы, у якіх ёсць сінонімы.**

1.Свет трымае ў страху атам, грозіць выбухам нейтрон.
2. Шчыра служыў Айчыне і выканаў загад, які дала яму Радзіма.
3. Хлеб пахне кменам, клёнавым лістом.
4. Міхась потым крыху астыў, супакоіўся, пачаў развАжаць.
5. Алесь аглядаў свой сектар уважліва, пільна.

**16.Адзначце словы, якія пішуцца разам.**

1. практычна _роўны; 2. вечна _зялёны; 3. чарна _вокі;
4. кафэ _малочнае; 5. кліна _падобны

**17.Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. Павел Сцяпанавіч падышоў да вітрыны магазіна, дзе ўбачыў прыгожы кашнэ.
2. Наша старое фартэпіяна ўсё яшчэ адзінока стаяла ў кутку вялікай клубнай залы.
3. Марылін дзядуля хуценька выйшаў і нечакана прынёс у хату вялізную ахапку сухіх сасновых дроў.
4. Успаміны пра вельмі цяжкія першыя гады замужжа былі для Наталлі як горкі палын.
5. У нашай знаёмай з суседняй палаты на гэтым тыдні нарадзіліся такія прыгожыя двайняты.

**18.У якім парадку трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст?**

1. На ім працавітыя насякомыя разводзяць грыбы. 2. У трапічным лесе часам сустракаюцца працэсіі мурашоў-лістарэзаў, якія нясуць на сабе дадому акуратна настрыжанае лісце. 3. Вучоныя даўно заўважылі, што што на гэтым лісці, як правіла, “едуць” іншыя мурашы, значна меншыя. 4. Гэта іх асноўны харч.

1. – 2, 1, 4, 3; 2. – 2, 3, 1, 4; 3. – 4, 3, 1, 2; 4. – 3, 4, 2, 1

**19.Вызначце стыль і тып тэксту.**

Калі месяц падняўся і пабялеў, можна было заўважыць на поплаве цёмныя і рухавыя постаці. Чым бліжэй яны падыходзілі да рэчкі, тым здаваліся большымі. Раптам замільгацелі ці то іскры, ці то гарачыя вугалькі. Адразу можна было пазнаць, што гэта паблісквацоь воўчыя вочы.

1. мастацкі, апісанне; 2. мастацкі, апавяданне; 3. гутарковы, апісанне; 4. публіцыстычны, разважанне

**20.Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя ці граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. Валодзя нядаўна быў сведкай на судзе, пра які цяпер многа гавораць у горадзе.
2. Некалі даўно давялося мне пагартаць гэты старажытны летапіс.
3. Падняўся неяк я з долу з невыказанай боллю.
4. Мы абагулілі нашы прыпасы і разам добра паснедалі.

## ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ
## ТЭСТ № 2

1. **Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук Ц.**
   1. палацы; 2. на кладцы; 3. падцмокваць; 4. падцёк; 5. Адсадзіць
2. **Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі.**
   1. грамадзянін, прыступка; 2. шэсцьдзесят, спрыяльны;
   3. вадзяны, струмень; 4. смаляны, смала; 5. назаўжды, спіна
3. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара О.**
   1. в _рабей; 2. в _стрыё; 3. адажы _; 4. дэк _рацыі; 5. Эфі _пія
4. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара Е.**
   1. жыцц _радасны; 2. вогн _тушыцель; 3. сін _вокі; 4. сво _асаблівыя; 5. хвал _падобны
5. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара І.**
   1. дэз _нфармацыя; 2. с _ходзіць; 3. за _грываць; 4. пера _манне; 5. між _нстытуцкі
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца прыстаўная літара.**
   1. _мжа; 2. _опыт; 3. на _огул; 4. _усаты; 5. _ордэн
7. **Адзначце словы, ў якіх пішацца літара Ў.**
   1. хлопцы _вішныя; 2. адзін _адзін; 3. а _кцыён; 4. кнігі - _сенародны скарб; 5. церушы _ дождж
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.**
   1. малац _ба; 2. вішан _ка; 3. восем _; 4. кон _скі; 5. дз _вюма
9. **Адзначце словы, у напісанні якіх дапушчана памылка.**
   1. каллектыў; 2. рашчапіць вагоны; 3. прыгожая панна; 4. капусны; 5. солнца
10. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф**.
    1. Васіл _еў; 2. шчаў _е; 3. раз _юшаны; 4. сям _я
11. **Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара.**
    1. (А,а)ндрэева шапка; 2. (Б,б)ыкаўскія героі; 3. (К,к)упалавы паэмы;
    4. (Н,н)алібоцкая пушча; 5. (К,к)аменны век
12. **Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаная літара.**
    1. у ру _цэ; 2. разво _дзе; 3. жыц _ё
13. **Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам.**
    1. пагорак; 2. каханне; 3. напоўзацца; 4. стрыгчыся; 5. Зверху
14. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў прамым значэнні.**
    1. *едкая* сатыра; 2. *калючы* ржэўнік; 3. тыф *косіць* людзей;
    5. *іскры* радасці; 5. *каравая* ануча

**15.Адзначце сказы, у якіх ёсць сінонімы.**

1. Завіруха вые, плача, тужыць, сцішыцца, каб нанава пачаць.
2. Гарачыня не спадала і пад вечар, стаяла спякота, якой дагэтуль не бачылі.
3. Вецер трапяткі і волкі ласкава люляе сіняву.
4. Мясціна была глухая, дзікая.
5. Павязлі цягнікі восень з вёсак у горад праз імглу, праз іржышчы, бары.

**16.Адзначце словы, якія пішуцца разам.**

1. хлапчук _гарэза; 2. віцэ _прэзідэнт; 3. вада _сховішча;
4. казачна _алегарычны; 5. хутка _цечны

**17.Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. На дзяўчыне было прыгожае кімано.
2. Надзейнага алібі ў суседа, на жаль, не было.
3. Запіс быў зроблены чарнiламі.
4. Віднелася пясчаная насып.
5. Каля школы расла высокая таполя.

**18.У якім парадку трэба размясціць сказы, каб атрымаўся тэкст?**

1. Бо ўсе мы на гэтай зямлі суседзі _рэчка і бусел, дрэва і травінка, кветка і пчала, рыба і водарасці, мураш і чалавек. 2. Мы часам забываемся, што прырода не толькі для нас адных… 3. Бо зямля ў нас адна, яна агульная для ўсіх. 4. Усе мы яе зямляне. 5. І ўсе мы маем радасць суіснаваць на ёй, жыць у сапраўднай дружбе і ўзаемнай павазе.

1. – 1, 5, 4, 3, 2; 2. – 4, 1, 2, 3, 5; 3. – 2, 1, 4, 3, 5; 4. – 3, 2, 1, 5, 4

**19.Вызначце стыль і тып тэксту.**

Раз улетку, напрацаваўшыся, што аж пот з мяне цурком каціў, губы пасмяглі, босыя ногі да крыві патрэскаліся, - зацягнуўся я на гару да свайго дзядулі аддыхнуць. Толькі прылажыўся гэта я, пачынаю драмаць… Ажно чую: нехта побач уздыхае…

1. мастацкі, апісанне; 2. гутарковы, апавяданне; 3. гутарковы, апісанне; 4. публіцыстычны, разважанне

**20.Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя ці граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. У дваццаці двух групах вучылішча паспяхо ва прайшлі першыя экзамены.
2. Старшыня нашага сходу адразу паведаміў, што кворум ужо прысутнічае.
3. Прывольны стэп апеты ў многіх народных песнях.
4. Наш сабака ўпарта бег па слядам зайца.

# <u>ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ</u>
# <u>ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ</u>
# <u>ТЭСТ № 3</u>

1. **Адзначце словы, у якіх вымаўленне зычных не адпавядае напісанню.**
   1. лёгкі; 2. добры; 3. носьбіт; 4. карта; 5. мяккі
2. **Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі.**
   1. пахмурны, дазіметр; 2.сухенькі, заінець; 3.вусы, імунітэт; 4.кісліць, кісліца; 5. Зажыва, камбайнер
3. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара А.**
   1. ш _птаць; 2. ш _рсць; 3. ш _рсцяны; 4. некат _ры; 5. ж _луды
4. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара А.**
   1. п _ўкіламетра; 2. п _літэхнічны; 3. м _тапяхота; 4. р _ўнамерна; 5. Н _вагрудак
5. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара І.**
   1. су _снаваць; 2. мед _нстытуцкі; 3. пера _маць; 4. пад _граць; 5. суб _нспектар
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца прыстаўная літара.**
   1. _мгненне; 2. _згорак; 3. _облака; 4. _чора; 5. _чоба
7. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара Ў.**
   1.душою ты ста _ чысцей; 2.ваенна- _ліковы; 3.адпачыць _ прахалодзе; 4.ла _рэат; 5. летам _рэчцы
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.**
   1. Вікенц _евіч; 2. ц _вік; 3. верф _; 4. грабен _чык; 5. кудыс _ці
9. **Адзначце словы, у якіх прапушчана літара.**
   1. міласэр _насць; 2. бя _страшны; 3. поз _на; 4. кампак _ны; 5. пале _скі
10. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф.**
    1. Салаў _ёў; 2. куп _ё; 3. саф _ян; 4. кампан _ён
11. **Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара.**
    1. (Н,н)асовічаў слоўнік; 2. (М,м)іністэрства замежных спраў; 3. (Б,б)елавежская пушча; 4. (Д,д)амоклаў меч; 5. (Б,б)рылёўскі стыль
12. **Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаная літара.**
    1. а _легорыя; 2. кало _се; 3. мадо _на
13. **Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам.**
    1. цеплыня; 2. баяніст; 3. абмалот; 4. пілаваць; 5. добры
14. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.**
    1. завязаць на моцны *вузел*; 2. лета *ідзе*; 3. вышываць крыжыкам па *канве*; 4. *далёкі* шлях; 5.*сардэчная* мышца

**15. Адзначце сказы, у якіх ёсць сінонімы.**

1. У гародчыку зноў кіпень белага бэзу, чаромхі.
2. Самым вялікім аўтарытэтам для яго была ісціна, пакланяўся толькі праўдзе.
3. Паветра чыстае, празрыстае, усё відаць далёка-далёка.
4. Людзі думаюць, што праца лесніка лёгкая і не вельмі адказная.
5. Люблю вясну, што ў кветкі, зелень аздобіць радасна зямлю.

**16. Адзначце словы, якія пішуцца разам.**

1. зямліста _буры; 2. чалавека _дзень; 3. жыцця _радасны;
4. пакаці _гарошак; 5. дрэва _падобны

**17. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. Кравец добра шые адзенне.
2. Ад страху сціснула грудзь.
3. Мама перасадзіць клубніку.
4. Помніцца пяшчотны дотык матчыных рук.
5. Бабулі завезлі сухія дровы.

**18. У якім парадку трэба размясціць прыведзеныя сказы, каб атрымаўся тэкст?**

1. Неспадзявана абрушылася яна на горад яркім і шчодрым сонцам. 2. Помню тую вясну – першую гарадскую вясну ў сваім жыцці. 3. Бабулі, што нядаўна прадавалі пралескі, трымалі ў руках букецікі гэтых далікатных кветак. 4. Тою вясною неяк асабліва рана зацвілі ў гародчыках на ўскраінах ландышы.

1. – 3, 2, 1, 4; 2. – 2, 1, 4, 3; 3. – 1, 4, 3, 2; 4. – 4, 2, 1, 3

**19. Вызначце стыль і тып тэксту.**

Карані дрэва пасля зімовага нябыту прагна пацягнулі з адталай зямлі сокі, і тыя пабеглі вышэй і вышэй, да галін і галінак, да сучка, што з восені ўчэпіста трымаў бурштынавы лісток. Салодкая дрыготка прабегла па агромністым целе, і клён прачнуўся. Ён страпянуў веццем і ўбачыў з вышыні тое, што сніў усю доўгую зіму.

1. мастацкі, апісанне; 2. мастацкі, апавяданне; 3. гутарковы, апісанне;
4. публіцыстычны, разважанне

**20. Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя ці граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. У двухстах метрах ад вёскі пачыналася прыгожая зялёная дуброва.
2. Вялікая па тым часе плошча зіхацела ад пражэктараў, ліхтароў і рознакаляровых гірляндаў.
3. Лета – час дажджоў жаданых, бліскавіц і перуноў.
4. Мы з маці хутка прачыталі гэты цікаўны раман.

# ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ
# ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ
# ТЭСТ № 4

1. **Адзначце словы, у якіх літара Ё абазначае два гукі.**
   1. вясёлы; 2. ёмістасць; 3. медальён; 4. куп'ё; 5. клён
2. **Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі.**
   1. крылаты, бяскрылы; 2. баравік, баравы; 3. таварыскі, нажніцы; 4. загадзя, абаяльны; 5. засень, спіна
3. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара А.**
   1. с _рдэчны; 2. Ж _нева; 3. сальфеджы _; 4. характ _р;
   5. Ч _рнышэўскі
4. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара О.**
   1. ф _ндасховішча; 2. бр _няпоезд; 3. г _рналыжны;
   4. с _кавыціскалка; 5. з _латаносны
5. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара І.**
   1. дэз _нфармацыя; 2. аб _сці; 3. за _кнуўся; 4. контр _гра;
   5. пры _мальнасць
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца прыстаўная літара.**
   1. за _ржавець; 2. _уха; 3. _окны; 4. _увага; 5. _мшара
7. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара Ў.**
   1. вазьм _ і застануся; 2. калёкві _м; 3. бетона _кладка;
   4. жанчына- _рач; 5. ляцець _ вырай
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.**
   1. дзевяц _сот; 2. восем _дзесят; 3. нос _біт; 4. будз _це;
   5. запол _ле
9. **Адзначце словы, у якіх дапушчана памылка.**
   1. абвесны; 2. кантрасны; 3. солнца; 4. наліснік; 5. Следчы
10. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф.**
    1. Н _ю-Йорк; 2. п _еса; 3. іў _еўскі; 4. між _ярусны
11. **Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара.**
    1. (Г,г)лушакоў надзел; 2 (К,к)араткевічаўскі стыль; 3. (А,а)хілесава пята; 4. (М,м)іністр лёгкай прамысловасці; 5. (М,м)іншчына
12. **Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаная зычная.**
    1. Адэ _са; 2. кры_ ле; 3. шас _цю
13. **Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам.**
    1. непарадак; 2. упоцемку; 3. зборны; 4. збочыць; 5. Ніхто
14. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты няправільна.**
    1.*водны* спорт; 2.*вынослівы* верх сасны; 3.*раскідзісты* дуб; 4.*суцішыць* боль; 5.*запаветная* зона пушчы

**15. Адзначце сказы, у якіх ёсць сінонімы.**

1. Бруіцца празрыстая рэчка, хаваецца ў ніцых кустах.
2. Зноў прагрымеў залп, такі ж магутны, грозны, сакрушальны.
3. Рэчкі бурлівыя, учора санлівыя, сёння ўсталі, плывуць і бурляць.
4. Песня не памерла тады, калі сканала паўстанне.
5. Ён адно чуў, як штосьці гняло яго, як згінала да зямлі.

**16. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.**

1. хата _лабараторыя; 2. практычна _роўны; 3. вясенне _палявы; 4. ультра _кароткі; 5. прэсна _водны

**17. Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. Раман набраў поўныя прыгаршчы малін.
2. Сястра задала маім бацькам такі клопат з гэтым вяселлем.
3. Ад хвалявання грудзь так і ўздымалася.
4. На канферэнцыі выступіла вядомы прафесар Новікава.
5. Такая недарэка яго сябра.

**18. У якім парадку трэба размясціць прыведзеныя сказы, каб атрымаўся тэкст?**

1. П’еш і дагэтуль не можаш напіцца пахам рамонку на росным папары. 2. Яно такое магутнае, што ажно сёння бачыш пераплеценую карэннем сцежку да аточанага лесам хутара. 3. Маленства… 4. Часам бачыш купіну з чмяліным гняздом, чуеш світальную песню дразда-перасмешніка ў сінім сасонніку. 5. Святло ясных бесклапотных дзён, як святло пагаслых галактык, ідзе праз гады, праз усё маё жыццё.

1. – 3, 5, 2, 4, 1; 2. – 2, 4, 3, 5, 1; 3. – 5, 3, 1, 2, 4; 4. – 2, 1, 4, 5, 3

**19. Вызначце стыль і тып тэксту.**

У жыцці Вялікага Лесу быццам нічога не змянілася. Усё рабілася, ішло па заведзеным невядома калі і кім парадку. Ледзь сплывала ноч, світала, вёску будзіла берасцяная труба. Гэта кульгавы пастух Хомка, перакінуўшы цераз плячо пугу-смалянку, кіраваўся на калгасную ферму займаць гавяду. Даілі і выганялі на пашу кароў, палілі ў печах…

1. навуковы, апісанне; 2. мастацкі, апавяданне; 3. гутарковы, апісанне; 4. публіцыстычны, разважанне

**20.Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя ці граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. Зусім блізка да суседняй вёскі ўчора падабраліся мужныя ваўкі.
2. Такія высокія дзверы ў вясковых хатах звычайна ніхто не робіць.
3. Тры свежых газеты ляжалі на ягоным заўсёды прыбраным пісьмовым стале.
4. У такой балотнай мясцовасці вільготнасць паветра вельмі высокая.

## ПРАВЕРАЧНЫЯ ТЭСТЫ
## ПА РОЗНЫХ РАЗДЗЕЛАХ МОВЫ
## ТЭСТ № 5

1. **Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар ДЗ абазначае два гукі.**
   1. падземны; 2. дзяжурства; 3. вадзіць; 4. адзваніць; 5. адзенне
2. **Адзначце радкі, у якіх усе падкрэсленыя галосныя абазначаюць націскныя гукі.**
   **1.** спіна, закутак; 2. бульбяны, крэдыт; 3. жаласлівы, лесавік; 4. гаіць, гаючы; 5. нагала, літасць
3. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара О.**
   1. стады _н; 2. в _стры; 3. тры _; 4. пр _цягнуцца; 5. др _гнуць
4. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара О.**
   1. к _негадоўля; 2. дв _яборства; 3. мн _гавугольны; 4. др _налессе; 5. д _макіраўніцтва
5. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара І.**
   1. дэз _нфіцыраваць; 2. пера _начыць; 3. аб _ржавелы; 4. транс _тальянскі; 5. пра _гнараваць
6. **Адзначце словы, у якіх пішацца прыстаўная літара.**
   1. за _льнозаводам; 2. _льготы; 3. _унук; 4. _одгук; 5. _унікальны
7. **Адзначце словы, у якіх пішацца літара Ў.**
   1. на _далую; 2. рады _с; 3. паўночна- _сходні; 4. ва _збекістане; 5. на _збярэжжы
8. **Адзначце словы, у якіх пішацца мяккі знак.**
   1. сядз _ма; 2. шэсц _дзесят; 3. мілен _кі; 4. вясел _ле; 5. з _мест
9. **Адзначце словы, у якіх прапушчана літара.**
   1. ра _злавацца; 2. пос _ны суп; 3. аванпос _ны; 4. ціс _нуць; 5.ра _сада
10. **Адзначце словы, у якіх пішацца апостраф.**
    1. здароў _е; 2. раз _язны; 3. міл _ярд; 4. кап _ё
11. **Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара.**
    1. (А,а)ленчына лялька; 2. (С,с)карынаўскія чытанні; 3. (Н,н)ямеччына; 4. (Г,г)ордзіеў вузел; 5. (М,м)інскія вуліцы
12. **Адзначце словы, у якіх ёсць падоўжаная зычная.**
    1. паўго _дзе; 2. дзевя _цю; 3. тэ _рыторыя
13. **Адзначце словы, утвораныя суфіксальным спосабам.**
    1. ніякаваты; 2. шчыры; 3. параіцца; 4. вераснёўскі; 5. асіннік
14. **Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.**
    1. *гарыць* лямпа; 2. павярнуць *галаву*; 3. *дагарае* восень; 5. *мякка* пасцяліць пасцель; 5. *вузел* палявых дарог

**15.Адзначце сказы, у якіх ёсць сінонімы.**

1. Высокая чарнявая жанчына стрымана ўсміхнулася.
2. Я жыў сярод добрых, душэўных і сардэчных людзей.
3. Як павее ветрык, скалыхнецца голле.
4. Імгла заслала далёкі сіні далягляд.
5. Сямён Іванавіч гаварыў разважна, стрымана.

**16.Адзначце словы, якія пішуцца асобна.**

1. цёмна _сіні; 2. жар _птушка; 3. крытычна _настроены;
4. анты _ваенны; 5. параўнальна _рэдкі

**17.Адзначце сказы з граматычнымі памылкамі.**

1. Нашы бацькі старэй за тваіх.
2. Дні позняй восенню значна карацейшыя.
3. Жаночая доля звычайна больш гарчэйшая, чым ваша, мужчынская.
4. Жыць у нашым горадзе стала намнога спакайней.
5. Бацькаў садовы ўчастак намнога большы за твой.

**18.У якім парадку трэба размясціць прыведзеныя сказы, каб атрымаўся тэкст?**

1. Убачыўшы драпежніцу, яна крыкнула нейкім ассблівым голасам: "Кра!". 2. Калі я выгнаў саву з сенцаў, то гэта заўважыла адна варона. 3. І ў кожным выпадку гэтае слоўца ўсяго толькі з трох літар азначае розныя паняцці. 4. Колькі слоў трэба чалавеку, каб выказаць свае думкі, а ў варон ўсяго толькі адно "кра".

1. – 3, 2, 1, 4;   2. – 2, 1, 4, 3;   3. – 4, 1, 2, 3;   4. – 1, 3, 2, 4

**19.Вызначце стыль і тып тэксту.**

Наш абавязак – шанаваць усё, што звязана з жыццём нашых продкаў, каб гэтак жа сама і нас шанавалі будучыя пакаленні. Яны наўрад ці нам даруюць, калі мы паступова не вернем людзям тыя былыя геаграфічныя назвы, у якіх так яскрава былі адлюстраваныя гісторыя і нялёгкае жыццё беларускага народа.

1. мастацкі, апавяданне; 2. публіцыстычны, разважанне;
3. навуковы, разважанне; 4. гутарковы, апавяданне

**20.Адзначце сказы, у якіх парушаны лексічныя ці граматычныя нормы беларускай мовы.**

1. Жыццё і дабрабыт селяніна заўсёды залежалі ад стану надвор'я.
2. Бацька збіраўся пасадзіць каля варот невялікае дрэўка.
3. У гаспадаровым пакоі стаяў стол і крэслы.